ЛІТАРАТУРА і мастацтва



18 лістапада 2005 г. № 46/4333

АНОНС

Нарэшце гэтае цудоўнае восеньскае свята — Свята Пісьменства — завітала і ў старажытны Камянец, што знаходзіцца на Берасцейшчыне. Сёння Камянец прымае, пад засенню сваёй Белай вежы, гасцей з усёй Беларусі, успамінае мінулае, даўнія векапомныя традыцыі, паказвае сучасныя дасягненні — усё, чым хата багата. Прыгожае свята! Да яго рыхтаваўся, дарэчы, не толькі Камянец, не толькі Брэсцкая вобласць, але і ўся краіна, асабліва сталіца — Мінск.

СТАР. 6

Лістападаўскі дзень напоўнены ціхім унутраным святлом. Быццам нехта з высокага-высака прасвечваў туман нябачным ліхтаром. Такім святлом, як задуменна кажа Марыя Андрэеўна Янішчыц, быў напоўнены і той дзень, калі нарадзілася яе Жэня, знакамітая беларуская паэтка, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы.

СТАР. 14

«Светлы, таленавіты, чысты...»

Споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння выдатнага пісьменніка, рупліўца на ніве культуры мовы Яна Скрыгана. “Гэта быў светлы, таленавіты, чысты, амаль па-дзіцячы вясёлы чалавек, да апошняга часу (апавяданні ў часопісе “Беларусь”) працавіты гранільшчык роднага слова”, — пісаў пра яго Янка Брыль.

Аўтар празаічных зборнікаў “Затока ў бурах”, “Сустрэчы”, “Апавяданні”, “Скажы адно слова”, “Выбранае”, “Кругі”, кніг нарысаў, успамінаў, партрэтаў, нататак і артыкулаў па праблемах літаратурнага майстэрства і культуры мовы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, ветэран працы, заслужаны работнік культуры БССР, Ян Скрыган быў і застаецца сапраўдным Майстрам слова.

Культурнай спадчыне — навуковую базу

Лабараторыяй музейнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры пры дапамозе ЮНЕСКА выдадзены ў друкарні ТДА "Геапрынт" зборнік артыкулаў "Школа музейных кансерватараў".

З мэтай належнага захавання культурнай спадчыны пры Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Рэспублікі Беларусь створаны Цэнтр прэвентыўнай кансервацыі. Адкрыццё Цэнтра і правядзенне Школы музейных кансерватараў стала магчымым дзякуючы Праграме ўдзелу ЮНЕСКА 2004—2005 гг. і пры падтрымцы Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА ў Рэспубліцы Беларусь. У нашай краіне гэта першая спроба фарміравання дзейснай сістэмы кансервацыі археалагічных і этнаграфічных матэрыялаў, а таксама падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі музейных кансерватараў. У традыцыях беларускай музейнай практыкі існуе раздзяленне паняццяў "кансервацыя" і "рэстаўрацыя", апошняя мае мэтай ліквідацыю прычын разбурэння музейных прадметаў, умацаванне іх матэрыялаў і структуры, выдаленне тэхнічна шкодных налётаў, а таксама вызначэнне норм тэмпературна-вільготнаснага рэжыму захавання і экспанавання. Прэвентыўная (прафілактычная) кансервацыя павінна забяспечыць паўнавартасны клопат аб існуючых культурных каштоўнасцях, абараняючы такім чынам нацыянальную ідэнтычнасць. "З добра захаванымі помнікамі проста і зручна ўпісацца ў глабальную прастору сусветнай культуры", — такі дэвіз укладальнікаў гэтага выдання.

Адрасаваны ў першую чаргу слухачам школы, зборнік навукова-метадычных артыкулаў складаецца з раздзелаў "Бытавая кераміка" і "Этнаграфічны тэкстыль". Укладальнікі і аўтары выдання — А. Сташкевіч, Н. Здановіч, А. Міцкевіч, Л. Дамнянкова, М. Віннікава, М. Барткова — дэманструюць сістэмны падыход да праблем музейнай кансервацыі, засяродзіўшы ўвагу чытачоў не толькі на матэрыялах, якія непасрэдна датычацца рэстаўрацыйных методык, але і на апісанні саміх прадметаў, спецыфікі іх тэхналогіі і марфалогіі. У зборнік уключаны тэрміналагічныя тлумачэнні і падрабязная бібліяграфія, прыводзіцца і варыянт рэстаўрацыйнага пашпарта. Артыкулы багата праілюстраваны, падрабязна разглядаюцца старажытная тэхніка выканання, таму кніга цікавая шырокаму колу чытачоў.

Вольга ПАЎЛЮЧЭНКА

Вялікія мінчане

Навуковая канферэнцыя пад такой назвай прайшла ў тэатральнай зале Чырвонага касцёла пры падтрымцы Польскага Інстытута ў Мінску.

На форум, прысвечаны выбітным мінчанам — дзеячам культуры, асветы і рэлігіі XIX—XX стагоддзяў, сабраліся вучоныя-гісторыкі Беларусі і Польшчы, грамадскія дзеячы, прадстаўнікі няўрадавых арганізацый. Фактычным арганізатарам мерапрыемства выступіў Вроцлаўскі універсітэт.

У канферэнцыі прынялі ўдзел прадстаўнікі ўсіх традыцыйных для Беларусі канфесій — праваслаўя, каталіцызму, іудаізму, ісламу. Асобы, пра якіх распавядалі вучоныя, таксама мелі рознае веравызнанне.

Айцец І.Андрыянаў паведаміў пра трагічны лёс Біскупа Мінскага і Тураўскага Мітрафана (Краснапольскага), праваслаўнага дзеяча, дэпутата 3-яй расійскай Думы, які ў 1919-м годзе быў закатаваны бальшавікамі, а потым далучаны да ліку святых. Малады магістр Маслоўскі з Вроцлава прачытаў вельмі змястоўны, але не зусім дасканалы даклад аб становішчы каталікоў на беларускіх землях у перыяд пантыфікату Папы Пія IX (падзелы Рэчы Паспалітай). Прафесар Эмануіл Іофе з Міжнароднай акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцяў і Разалія Александровіч з Нацыянальнага інстытута адукацыі распавялі пра жыццё супольнасцяў яўрэяў і татараў у Беларусі на мяжы пазамінулага і мінулага стагоддзяў.

Мікалай АНІШЧАНКА

СТАНУ ПЕСНЯЙ У НАРОДЗЕ!

100 гадоў з дня выхаду кнігі Цёткі "Хрэст на свабоду" адзначылі ў сталічнай бібліятэцы № 15. Вечарына прайшла ў класічным стылі, але з маладзёжным акцэнтам. Гучала музыка (гітара, скрыпка, дуда, фартэпіяна), выконваліся песні, чыталіся вершы, была арганізавана выстава дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Нават сама Алаіза Пашкевіч прысутнічала на свяце. Праўда, увасабляла яе паэтэса Аксана Спрынчан.

Рыхтавацца да імпрэзы пачалі яшчэ вясной, калі аб'явілі рэспубліканскі літаратурны конкурс. Паўдзельнічаць у ім і пазмагацца за прызы бібліятэкі выказаліся многія. Але пашанцавала не ўсім. Першае месца атрымаў Вінцусь Бянёха з Астраўца, другое Яніна Грыцкевіч з Лунінецкага раёна, трэцяе — Настасся Нарэйка з Маладзечна. У намінацыі "Персанальныя прызы" перамогу атрымалі: Дзмітрый Ермаловіч-Дашчынскі (Мінск), Віталь Шыёнак (Віцебск), Галіна Юркевіч (Мінскі раён). А дырэктару школы №3 горада Вілейка Мікалаю Гіро аб'явілі падзяку "За актыўны ўдзел у рэспубліканскім конкурсе на лепшы верш і за вялікі ўнёсак у выхаванне творчай моладзі".

— Прыемна, што ёсць людзі, якія пішуць вершы, чытаюць Цётку і сучасную беларускую літаратуру, — гаварылі падчас уручэння прэмій два старшыні журы літаратурнага конкурсу Віктар Шніп і Людміла Рублеўская. — *Выдавецтва "Мастацкая літаратура" заўсёды падтрымлівала і будзе падтрымліваць моладзь, бо яна — рухавік развіцця айчыннай літаратуры. А тое, што ў нас расце добрае пакаленне пісьменнікаў, несумненна.*

Бібліятэка Цёткі таксама падтрымлівае маладых і творчых людзей. Пра гэта гаварыла загадчыца Рэгіна Багамолава:

— Моладзь для нас – аб'ект павышанай увагі. Мы ладзім шмат імпрэз і заўсёды запрашаем тых, хто пачынае свой творчы шлях, з задавальненнем вітаем іх у сценах Дома Цёткі. Нам цікава параўноўваць два пакаленні: тое, калі пісала Алаіза Пашкевіч, і гэтае, калі пішуць сучаснікі. Здаецца, эпохі розныя, але любоў да слова, энергетыка творчасці, паэтычнае дыханне аднолькавыя. І гэта прыемна.

Вечарына атрымалася запамінальнай. Выступалі як вядомыя барды (Зміцер Сідаровіч, Серж Мінскевіч), так і пачаткоўцы (Таццяна Пузенка). Дарэчы, Таццяна парадавала прысутных прэм'ерай песні на словы Цёткі. Астатнія вершы са зборніка "Хрэст на свабоду!" гучалі ў суправаджэнні скрыпкі. Граў на ёй маленькі музыкант Арсеній Асіеўскі.

Для Цёткі з новымі творамі выступілі сябры суполкі "Літаратурнае прадмесце", гучала таксама паэзія Віктара Шніпа. Многім спадабаўся танец "Таўкачыкі" ў выкананні Зміцера Сідаровіча і ўдзельніцы літаратурнага конкурсу Ульяны Трафімец. А развітальным акордам трохгадзіннай праграмы стала выступленне папулярнага гурта "Жаба ў каляіне" і Мюра Фарыдовіча, які таксама парадаваў прысутных, выкарыстаўшы вобраз Цёткі ў сваёй літаратурнай кампазіцыі.

Зміцер АРЦЮХ

Фота Аляксандра Рабцэвіча

У Купалаўскай бібліятэцы адбылася прэзентацыя літаратурна-мастацкага выдання "Дзень паэзіі — 2005".

Паэтычнае сяброўства

Сорак гадоў назад гэты альманах, ініцыятарам і стваральнікам якога быў Максім Танк, змяшчаў творы каля 10 аўтараў. У перадапошнім зборніку (за 1993/1994 г.), складзеным Віктарам Шніпам, было ўжо 164 паэты, у сёлетнім альманаху — 204, што сведчыць, па словах В.Шніпа, пра багаты творчы патэнцыял нашай літаратуры.

На імпрэзе перад наведвальнікамі бібліятэкі, школьнікамі, аматарамі беларускага паэтычнага слова выступілі: дырэктар выдавецтва "Мастацкая літаратура" Уладзіслаў Мачульскі, намеснік галоўнага рэдактара выдавецтва і ўкладальнік "Дня паэзіі-2005" Віктар Шніп, намеснік галоўнага рэдактара часопіса "Маладосць", паэт Алесь Бадак. Таксама свае вершы чыталі некаторыя з аўтараў "Дня паэзіі": Браніслаў Спрынчан, Аксана Спрынчан, Рагнед Малахоўскі, Аксана Данільчык. Песні на словы знакамітых беларускіх паэтаў (У.Караткевіча, Л.Геніюш і інш.) прагучалі ў выкананні Алеся Камоцкага.

Н.Я.

«ПРАВАСЛАЎЕ і СУЧАСНАСЦЬ»

Пад такой назвай з 14-га па 19-га лістапада ў Мінску праходзяць Чацвёртыя Свята-Міхайлаўскія Праваслаўныя Чытанні.

Іх правядзенне мае на мэце больш глыбокае асэнсаванне ролі і месца Праваслаўя ў фарміраванні і развіцці сусветнай ды агульнаславянскай духоўнасці, культуры, навукі ў сучасных умовах. Аб гэтым заявіў падчас выступлення ў грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы намеснік Старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ па міжнародных справах і сувязях з СНД , член арганізацыйнага камітэта Чытанняў Юрый Астапчанка.

Значны грамадскі рэзананс, які мелі папярэднія Чытанні, што праходзілі ў нашай краіне ў 2000 — 2002 гадах, пацвердзіў надзённую неабходнасць адраджэння тысячагадовай спадчыны хрысціянскай культуры, уз'яднання духоўнасці і навуковага прафесіяналізму ва ўсіх галінах грамадскай думкі і дзейнасці.

— Няцяжка заўважыць, што з кожным годам супрацоўніцтва праваслаўнай царквы і дзяржавы становіцца больш цесным і плённым, — зазначыў намеснік старшыні Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў РБ Уладзімір Ламека, таксама член аргкамітэта. — І гэта цалкам лагічна, калі ў грамадстве існуе такое мноства самых розных і вельмі балючых праблем на ніве духоўнай. Куды прасцей вырашаць іх разам...

Чацвёртыя Свята-Міхайлаўскія Чытанні ўключаюць у сябе цыкл лекцый на базе сталічных вышэйшых навучальных устаноў (сярод якіх — Ваенная Акадэмія Рэспублікі Беларусь, Акадэмія МУС РБ, Белдзяржуніверсітэт і інш.), канферэнцыю "Праваслаўе і сучаснасць", "Царква і адукацыя", "Царква і грамадства, навука, культура" — такія тэмы больш як сямідзесяці дакладаў, заяўленых на ўдзел у чытаннях: з імі выступяць святары, вучоныя, выкладчыкі ВНУ.

З блаславення мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Свята-Міхайлаўскія Чытанні праводзяцца Праваслаўным Брацтвам у гонар Святога Архістраціга Міхаіла і іншых Нябесных сіл бясплотных.

Інеса ПЕТРУСЕВІЧ

ЛЮБІЦЕ КУПАЛУ!

Паэме Я. Купалы "Сон на кургане" 95 гадоў. З гэтай нагоды Літаратурны музей імя Янкі Купалы гасцінна расчыніў свае дзверы для ўсіх прыхільнікаў творчасці гэтага выдатнага паэта.

Пра жыццёвы і творчы шлях Янкі Купалы распавядаў вядучы, ён жа супрацоўнік музея, Зміцер Бубнаў. У вечарыне прынялі ўдзел: мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра Беларусі імя М.Горкага Барыс Луцэнка, паэт Леанід Дранько-Майсюк і даследчык творчасці Купалы Уладзімір Содаль.

"1910 год для нас вельмі містычны, — сказаў Л.Дранько-Майсюк, — бо ён паклаў пачатак навейшай метафізічнай літаратуры. Як паэтычны твор, "Сон на кургане" дастаткова складаны і патрабуе вельмі пільнай чытацкай увагі. Ён упрыгожаны алегорыямі і шматграннымі сімваламі. Самы цікавы вобраз гэтай паэмы – вобраз Сама. І для мяне, як для прафесійнага чытача, бачыцца за ім філасофія нашай нацыянальнай няўпэўненасці. Бо невыпадкова Сом прамаўляе: "... Хаджу і блуджу я колькі гадзін. Куды не ступлю, не бачу пуцін." І гэта тэма адна з вечных, таму паэма і век жывая! Любіце Купалу і ён адкажа на ўсе вашыя пытанні!"

Прыемным падарункам для ўсіх прысутных стала выступленне вучняў школы№13 імя Янкі Купалы, якія выканалі ўрывак з паэмы "Сон на кургане".

Святлана КАНАНОВІЧ

«Восень» пачынаецца...

Па ўсёй краіне пройдуць імпрэзы 32-га Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Беларуская музычная восень". У Мінску ён урачыста адкрыецца 20 лістапада. Праграма гэтага вечара прымяркоўваецца да 80-годдзя з дня нараджэння народнага артыста Беларусі, кампазітара, класіка песеннага жанру Юрыя Семянякі. У канцэрце бяруць удзел Нацыянальны акадэмічны народны аркестр Беларусі імя Жыновіча з дырыжорам А.Высоцкім, Дзяржаўны камерны хор Беларусі, нашы лепшыя салісты. Працягнецца фестываль да 3-га снежня. Яго закрыццё будзе пачаткам ужо наступнага вялікага творчага праекта: Міжнароднага конкурсу піяністаў "Мінск. Фартэпіяна-2005".

С.Б.

Прыгожая і неабходная

Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны зноў сабрала шчырых прыхільнікаў беларушчыны на чарговы, IX з'езд. Тут абмяркоўваліся асноўныя напрамкі і вынікі дзейнасці таварыства, гаварылася пра значнасць глыбокага вывучэння гісторыі беларускай мовы, узнімаліся праблемы яе развіцця, захавання чысціні і самабытнасці, пашырэння ўжытку ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. У прыватнасці намеснік Старшыні ТБМ, мовазнаўца Людміла Дзіцэвіч вызначыла важныя акалічнасці, без якіх не можа адбыцца ўпэўнены выбар сваёй мовы. Паводле яе слушнага меркавання, першым крокам з'яўляецца станоўчая ацэнка беларускай мовы, калі замест такіх эпітэтаў ў адносінах да яе, як "калгасная", "непрыгожая", "непатрэбная", "непапулярная" і таму падобнага будуць гучаць: "моцная", "прыгожая", "багатая", "стваральная", "дзейсная", "неабходная" і г.д.

Вывучэнне роднай мовы ў школах і ВНУ, выкарыстанне яе ў паўсядзённым жыцці, культурнае значэнне, месца ў свеце, нарэшце граматычны склад, стылістычныя асаблівасці — пералік праблемных і палемічных пытанняў можна доўжыць. Зразумела, усе яны патрабуюць далейшага грунтоўнага абмеркавання, прыняцця ўзважаных рашэнняў, але разам з тым з'яўляюцца яскравым сведчаннем актыўнага моўнага жыцця.

Н.Я.

Свая маленькая краіна

Менавіта так абазначылі тое, што адбывалася на пачатку лістапада пад дахам Дома дружбы падчас сустрэчы сяброў — прадстаўнікоў нашай краіны і братніх Сербіі і Чарнагорыі.

Хлеб і вада гучаць аднолькава як па-беларуску, так і па-сербску. І гэтае падабенства, блізкасць нікога не здзіўляюць, бо паміж двума славянскімі народамі шмат агульнага не толькі ў мове, але і ў гісторыі, рэлігіі, а карані гэтых повязяў сягаюць ў глыбіню стагоддзяў.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Сербія і Чарнагорыя ў Рэспубліцы Беларусь Срэчка Джукіч паведаміў прысутным, што сёлета студэнты філалагічнага факультэта БДУ пабывалі ў Белградзе, а іх студэнты прыязджалі ў Мінск. З 23 лістапада па 1 снежня гэтага года, у братняй краіне пройдуць Дні культуры Беларусі.

Нядаўна ў Мінску праходзіў міжнародны тэатральны фестываль "Залаты віцязь", у якім прынялі ўдзел акцёры і тэатральныя дзеячы з Сербіі і Чарнагорыі. Яны таксама завіталі ў Дом дружбы.

Прысутнічалі ў зале і беларускія майстры сцэны. Многіх уразіла, з якой экспрэсіяй выканала беларускую народную песню актрыса купалаўскага тэатра Святлана Зелянкоўская. Адным словам, вечар атрымаўся.

Раіса МАРЧУК

Слухалі з цікавасцю

Не трымцець, не трызніць, не плакацца над гісторыяй, літаратурай і роднай мовай, а самаахвярна і аддана працаваць на карысць Бацькаўшчыны — такім быў лейтматыў сустрэчы з пісьменнікам Уладзімірам Арловым, што адбылася ў краязнаўчай зале Баранавіцкай цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Валянціна Таўлая.

Варта аддаць належнае творцу, які адразу зачараваў прысутных і зрабіў іх актыўнымі ўдзельнікамі гэтай падзеі. Вялікая колькасць пытанняў не парушыла расказ аб сабе, аб творчым працэсе, а наадварот, дапамагла стварыць непаўторную атмасферу, дзе ўсе былі напоўні.

Вядома, гасцінныя гаспадары не адпусцілі Уладзіміра Арлова без падарункаў і кветак. Шчодры быў і госць, які натхнёна і радасна адорваў прыхільнікаў сваёй творчасці аўтографамі.

Міхась МАЛІНОЎСКІ

ПРАРОКУ І ЧАЛАВЕКУ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА...

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа і Першамайскі раённы выканаўчы камітэт г.Мінска сталі арганізатарамі XXI рэспубліканаскага літаратурнага свята "Каласавіны", прысвечанага 123-й гадавіне з дня нараджэння славутага песняра.

Удзельнікаў свята, якое адзначалася на самым пачатку лістапада, віталі: старшыня Рады дырэктараў дзяржаўных музеяў Беларусі, дырэктар музея Якуба Коласа Зінаіда Камароўская, першы сакратар Пасольства Украіны ў Рэспубліцы Беларусь, даўні сябар музея Станіслаў Удовенка, дырэктар музея Максіма Рыльскага (Украіна) Вікторыя Калеснік, намеснік кіраўніка адміністрацыі Першамайскага раёна Вера Богдан. З цёплымі, шчырымі словамі выступілі шаноўныя госці і ўдзельнікі мерапрыемства: Мікола Аўрамчык, Аляксандр Падлужны, Яраслаў Клімуць, Аляксандр Лукашанец.

У межах "Каласавін" адбылася XX навуковая канферэнцыя "Якуб Колас і яго асяроддзе", на пленарным пасяджэнні якой прагучалі надзвычай цікавыя даклады — "Пісьменнік і яго акружэнне: тэарэтычныя і практычныя аспекты праблемы" Міхася Мушынскага, "Слова пра дзядзькоў Якуба Коласа" Міхася Міцкевіча, сына паэта, "Дружба, загартаваная ў гарніле вайны і кузні мірнай працы (Успаміны пра Якуба Коласа і Васіля Казлова)" Вольгі Казловай. Пра глыбокае вывучэнне неабходных для гісторыі, літаратуры і мовы пытанняў, звязаных з творчасцю ды лёсам песняра, сведчаць назвы секцый канферэнцыі: "Творчае асяроддзе Якуба Коласа ў літаратурна-грамадскім кантэксце першай паловы XX стагоддзя", "Пытанні тэксталогіі і лінгвістыкі ў творчасці Якуба Коласа".

Наступным этапам у святочным мерапрыемстве стала прэзентацыя зборніка санетаў, "спавітых дзеразой" Міколы Маляўкі пад назвай "Старая зямля". Паводле слоў аўтара, гэта "кніга лёсу адной вёскі. Некалі гаспадарлівая, гасцінная, песенная, яна заняпала: паміраюць людзі і хаты, зарастаюць травою і кустоўем агароды, дзічэюць сады..." На пытанні "Чаму так здарылася? Хто вінаваты?" — паэт і спрабуе знайсці адказы.

Прэзентацыі літаратурнага выдання саступіла месца знаёмства з жывапісным палатном — трыпціхам акварэляў Івана Пратасені "Ноч", напісанага паводле аднайменнага верша Якуба Коласа.

"Паэт і муза" — так называлася заключная літаратурна-музычная кампазіцыя. Тут выступілі артысты Алег Вінярскі і Алена Пастрэвіч, Эдуард Зарыцкі выканаў песні на Коласавы вершы.

Сапраўды народнае свята "Каласавіны" яшчэ раз яскрава засведчыла, што, як сказаў Мікола Аўрамчык, "не забыты вялікі духоўны прарок і вельмі зямны чалавек..."

Наталля ЯКАВЕНКА
Фота В. СІБРЫКАВА

Вітаем сяброў!

Прэзентацыя культуры і мастацтва Славацкай Рэспублікі "Белае прывітанне для Беларусі" займела літаратурны працяг. У рамках праекта адбылася сустрэча беларускіх і славацкіх пісьменнікаў, якія не толькі пазнаёмілі прысутных са сваёй творчасцю, але і абмеркавалі праблемы сучаснай прозы і паэзіі, акрэслілі перспектывы будучага супрацоўніцтва.

Вечарыну ў Доме дружбы наведалі майстры беларускага слова — Яўген Каршукоў, Сяргей Панізнік, Мікола Мятліцкі. Ганаровым госцем стаў знаны пісьменнік Дадо Надзь. Ён жа і распавёў пра сённяшні дзень славацкай літаратуры. Як зазначыў спадар Надзь, сучасны перыяд яе гісторыі распачаўся ў 90-ыя гады. Славакія набыла незалежнасць, што ў сваю чаргу выклікала значныя змены не толькі ў палітычным, але і культурным жыцці краіны. Шмат каму з пісьменнікаў давялося пакінуць творчую каляіну...

Але час не стаіць на месцы. Славацкая літаратура, гэтак жа, як і беларуская, паступова набывае "другое дыханне". З'яўляюцца новыя імёны, новыя творы, якія выклікаюць увагу з боку крытыкаў і чытацкай аўдыторыі. Пры гэтым не страчваюць сваёй актуальнасці літаратурныя здабыткі мінулых гадоў. На ўздыме нацыянальныя тэатр, музыка і паэзія. Таму не дзіўна, што, маючы столькі агульнага, нашыя краіны вырашылі на ўзаемнай аснове ліквідаваць некаторыя інфармацыйныя прабелы.

Культура — найлепшы сродак яднання народаў, шлях да паразумення. І першыя крокі на ім ужо зроблены. Лагічным працягам стане праграма, прымеркаваная славацкім бокам да 20-ай гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Так ужо здаўна заведзена паміж сапраўднымі сябрамі: быць разам не толькі ў радасці, але і ў смутку.

Святлана САЎКО

ВЫСТАВЫ ААН

Нядаўна ў памяшканні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі прайшлі дзве выставы, прысвечаныя 60-годдзю Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Фотавыстава "60 год ААН: гістарычнае падарожжа" запрашала да прагляду здымкаў з калекцыі Бібліятэкі фотаматэрыялаў ААН. Экспазіцыя ахапіла ўвесь перыяд яе існавання: ад канферэнцыі 1945 года ў Сан-Францыска да Сусветнага саміта, які адбыўся сёлета ў Нью-Йорку. Таксама гледачы маглі азнаёміцца са здымкамі, якія адлюстроўваюць працу ААН у разнастайных кутках планеты.

Выстава "Арганізацыя Аб'яднаных Нацый у сучасным свеце" прапанавала азнаёміцца з больш як сотняй дакументаў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі на беларускай, рускай і англійскай мовах. Экспанаты падзяляліся на наступныя раздзелы: асноўныя веды пра ААН, правы чалавека, эканамічнае і сацыяльнае развіццё, падтрыманне міру і міжнароднай бяспекі, ААН і Беларусь.

Апошні раздзел экспазіцыі асабліва важны для нашай краіны, бо Беларусь з'яўляецца адной з краін-заснавальніц ААН. Гэта — яшчэ адзін напамін усяму свету пра асаблівы статус нашай радзімы.

Анатоль ВАСІЛЬЧАНКА

НОВЫЯ СУСТРЭЧЫ «ВОЖЫКА»

Нядаўна рэдакцыя часопіса "Вожык" правяла некалькі новых творчых сустрэч у Магілёўскай і Віцебскай абласцях. У памяшканні Горацкай карціннай галерэі адбылася прэзентацыя першай кнігі сатырыка, аўтара і сябра "Вожыка" М. А. Уласенкі "Мелочи жизни». Ва ўтульнай зале сабралася шмат калег-журналістаў, прадстаўнікоў мясцовай інтэлігенцыі. Галоўны рэдактар "Вожыка" Ул. Саламаха даволі высока ацаніў "карацелькі" Уласенкі: трапныя, вострыя, смешныя, а часам і па-філасофску мудрыя, — словам, вожыкаўскія па духу. Потым ад імя Саюза пісьменнікаў ён уручыў членскі білет вядомаму горацкаму навукоўцу, літаратуразнаўцу У. Ліўшыцу, а М. Уласенку — пасведчанне карэспандэнта "Вожыка". Ягоную кнігу цікава, з гумарам "адрэцэнзаваў" вожыкавец Казімір Камейша, а Павел Саковіч прачытаў прысвечаныя М. Уласенку і У. Ліўшыцу эпіграмы.

Мініяцюры горацкага сатырыка ахвотна друкуюць розныя выданні. Аб гэтым сведчылі выступленні галоўнага рэдактара Магілёўскай газеты "Зямля і людзі" У. Капузы, карэспандэнта "Народнай газеты" В. Кубекі, адказнага сакратара горацкай газеты "Ленінскі шлях" П. Дзятліковіча, супрацоўніка "Рэгіональных ведомостей" Э. Брокарава.

Цёпла, з гумарам гаварылі пра свайго сябра-сатырыка навукоўцы Горацкай акадэміі Я. Яроцкі, І. Скаромны, М. І. Скрылёў.

Назаўтра вожыкаўцы наведалі вядомы педкаледж у пасёлку Леніна. Госці з Мінска адказалі на пытанні слухачоў, падарылі бібліятэцы і навучэнцам свае кнігі з аўтографамі.

Дзве новыя сустрэчы прайшлі ў Оршы. У 22-й СШ, што ў Барані, вожыкаўцы былі ўжо раней. На гэты раз па просьбе дырэктара Ю. Нагорнага тут прайшла прэзентацыя апошняй, пасмяротнай кнігі Алеся Пісьмянкова "Думаць вершы". У яе абмеркаванні актыўны ўдзел прынялі старшакласнікі, а некаторыя з іх прачыталі свае творы.

У аршанскай бібліятэцы імя У. Корбана вожыкаўцаў чакалі не толькі чытачы, але і члены Народнага клуба ветэранаў "Яшчэ не вечар". Як расказала дырэктар гэтай установы А. Свірская, іх чытачы з задавальненнем пазнаёміліся з выставай вожыкаўскіх карыкатур, якая была разгорнута тут у сувязі з юбілеем У. Корбана. Уважліва слухалі прысутныя ўспаміны мінскіх гасцей пра Алеся Пісьмянкова. Пра асабістыя ўражанні ад сустрэчы з выдатным паэтам расказалі дырэктар аршанскай гарадской ЦБС Г. Самарукава, дырэктар музея Уладзіміра Караткевіча Г. Юркевіч. Падчас прэзентацыі было прачытана шмат вершаў Алеся Пісьмянкова, у тым ліку і сатырычных, апублікаваных у свой час у "Вожыку".

І. АРШАНСКІ

Руплівы аберагальнік СЛОВА

Мне ў жыцці пашчасціла на сустрэчы, размовы, знаёмствы і нават сяброўства з многімі выдатнымі асобамі беларускай культуры. Сярод іх — выбітная постаць пісьменніка, дбайнага, нястомнага і клапатлівага рупліўца на ніве беларускага слова, цікавага субяседніка і проста выдатнага Чалавека Яна Скрыгана.

Першае грунтоўнае далучэнне да ягонай творчасці адбылося падчас вучобы на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Тады ж запачаткавалася знаёмства з Іванам Аляксеевічам. Адбылося гэта не толькі таму, што ён быў "праграмным" пісьменнікам. Я, як і шмат хто са студэнтаў меў ахвоту вастрыць свае навыкі даследчай працы ў факультэцкім студэнцкім навуковым таварыстве. Маё даследаванне называлася "Янка Скрыган і Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна".

Памятаю, спачатку закапаўся ў газеты, часопісы, кнігі, каб грунтоўна падрыхтавацца да сустрэчы з Янкам Скрыганам. А што яна будзе патрэбнай, не сумняваўся. Бо, каб выканаць навуковае заданне, мала было саміх твораў. Хацелася жывых і свежых уражанняў. Неўзабаве атрымаў іх напоўніцу — Іван Аляксеевіч згадзіўся на сустрэчу. І нават не адну.

Гэта з вышыні сённяшніх гадоў не выглядаюць тыя гаворкі нечым выключным. На той жа час для мяне асабіста такое знаёмства не адно па кнігах, а непасрэдна, з вока на вока, было немалой раскошай. Ды яшчэ на кватэры пісьменніка. Каб не было сорамна, прыйшлося перачытаць не толькі ўсё напісанае ім, але і адшукаць тое нешматлікае, што датычыла жыцця ў выгляе не аднаго Янкі Скрыгана. Гэтага было малавата. Вось і давялося ісці да аўтара вядомых і папулярных "Кругоў" — галоўнай кнігі пісьменніка з надта сімвалічнай назвай, дзе цесна спляліся і асабістыя перыпетыі жыцця, і мастацкі лёс герояў. Мяне найперш цікавіла, як нараджаліся творы, як выспельваліся задумы, якая атмасфера панавала на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педфака універсітэта падчас вучобы празаіка.

Іван Аляксеевіч напачатку падаўся не надта гаваркім субяседнікам, чым нават напалохаў: навошта я ўзяўся за непад'ёмную працу, навошта турбую занятага важнымі справамі чалавека, бо ўсё адно не спраўлюся з навуковым заданнем. Асабліва неахвотна гаварыў ён пра балючае: нялюдскія гады высылкі. Яно і зразумела: ці варта перад кожным раскрываць душу, спавядацца. А што да іншага, то — "усё ў маіх творах, — казаў ён сваім трохі таропкім голасам. — Пра ўсё там сказаў, а калі што не ўдалося, то сёння ўжо не выправіш... Чытайце. Але з розумам. Бо ёсць тое, што сёння я не выносіў бы на людзі. Слабое. А тады час быў такі. Ад напісанага, аднак, не адмаўляюся. Маё застанецца маім. Чытайце, калі чаго там не хопіць, прыходзьце..."

Як бы пацвярджэнне гэтай думкі, але памножанае на высокую патрабавальнасць да сябе і творчасці наогул, знайшоў я нашмат пазней у адным з выказванняў Івана Аляксеевіча: «Здагадаўся, чаму я не люблю аднаго моднага, даволі вядомага пісьменніка. Нечым ён падобны на мяне ў пару мае літаратурнае маладосці. Ад тых маіх твораў мне цяпер аж нядобра, лепш бы іх не было». Гэта было праз гады, а я тады акурат «парой літаратурнай маладосці» Янкі Скрыгана і цікавіўся.

Удумліва чытаў і прыдзірліва перачытваў і тое, што ўражвала не аднаго мяне, і тое, што сам аўтар не адносіў да набыткаў, я намагаўся зразумець: чаму. Гэта дапамагло хоць трохі ўвайсці ў «творчую лабараторыю» пісьменніка. Тое, што было не да канца зразумелым альбо для мяне супярэчлівым, ахвотна тлумачыў падчас чарговых сустрэч Іван Аляксеевіч. З кожным разам ён станавіўся ўсё больш зразумелым мне, а ў гаворках больш шчырым і разняволеным. Ахвотней прыадкрываў сваю творчую манеру, разважаў не толькі пра свае творы, а пра літаратуру наогул, пра ролю мовы ў стварэнні адметнага вобраза, пра цяжкасці пошуку адзінага, дакладнага слова для выказу аўтарскай задумы і перадачы таго ўнутранага стану, які рухае творчымі памкненнямі.

Адчувалася, што пісьменнік сапраўды «перахварэў» празмерным захапленнем квяцістасцю, перасцерагаў іншых ад непатрэбнага словаспляцення, прыводзіў прыклады з літаратурнага жыцця 20-х і 30-х гадоў, сведкам і актыўным удзельнікам якога ён быў. Нават пра кур'ёзныя выпадкі згадваў і сам ахвотна смяяўся сваёй непаўторнай —скрыганаўскай усмешкай.

Зазначаў, што многае з тагачаснага было данінай модзе і часу. Найперш мо ў прозе, дзе знешнія эксперыменты асабліва кідаліся ў вока. Хоць проза прасіла спакойнага роздуму, коласаўскай мудрасці, яе чамусьці рвалі на кавалкі рознымі паўзамі, клічнікамі, шматкроп'ямі: хацелі надаць нетутэйшы, мадэрновы выгляд нават знешне. Прызнаваўся, што тады яго асабіста больш вабіла вёска, жыццё сялян, якое добра ведаў, ды часам даводзілася пісаць пра заводы, фабрыкі, пра рабочы клас, які для яго, безумоўна, быў не надта свойскім. Аднак павевы часу патрабавалі пашырэння напрамкаў беларускай літаратуры. Маладыя адгукаліся на гэта першымі. Хоць мастацкасць і дасканаласць не станавіліся галоўнай адметнасцю такіх твораў, затое аўтары ішлі ў нагу з часам — асвойвалі новую тэматыку. Не пазбег гэтага і Янка Скрыган.

Пісьменнік заўсёды гаварыў, што трэба шанаваць слова, створанае народам, даказваў неабходнасць ужывання новатвораў, калі патрэбных адпаведнікаў не хапае ў мове для дакладнай і зразумелай перадачы сэнсу з'яў і падзей, тэхнічных і навуковых тэрмінаў. Прыводзіў прыклады, што сведчылі пра здатнасць і гнуткасць беларускай мовы. Я яшчэ больш пераконваўся, што нездарма Іван Аляксеевіч быў вядомы, як непахісны і патрабавальны аберагальнік роднага слова, разумеў, што да яго справядліва звярталіся па параду не адно энцыклапедысты альбо мовазнаўцы...

А на згаданым зборніку "Кругі" застаўся кароткі аўтограф аўтара: «Анатолю Бутэвічу, — гэты надпіс — з любоўю. Янка Скрыган. 5.4.70». Гэта тады, калі я пісаў сваю студэнцкую працу.

Але быў і працяг. Калі мы запрыязніліся больш грунтоўна, Іван Аляксеевіч не адмаўляўся наведвацца ў госці. Крыху больш як праз чатыры гады я не прамінуў пахваліцца ягоным колішнім надпісам. А ён узяў кнігу і дапісаў: «А цяпер сяджу за сталом, калі Бутэвічавай жонцы 25, і п'ю за іхняе здароўе і рады, што яны маладыя і харошыя...»

Дзякуй, Іван Аляксеевіч, за Вашу мудрую дабрыню.

Анатоль БУТЭВІЧ

«Дысертацыя» пісьменніка

"Бадай-што ўсё, зробленае мною, гэта нейкая частачка самога сябе".

Янка Скрыган

Амаль усе так кажуць: пісьменнік жыве сярод людзей. А дзе ж яму яшчэ жыць? Жыве, але як адчувае настроі і пачуцці людзей, ці імкнецца ісці да іх, каб параіць, дапамагчы. Я ведаю шмат беларускіх пісьменнікаў, замілаваных сваім краем, і амаль кожны з іх прызнаецца, што яму дарагія людзі, з якімі жыве на роднай зямлі. А ў сваю чаргу я, чытач, з удзячнасцю кажу, што ў мяне ёсць "свой" адметны пісьменнік, які аказвае дабратворнае ўздзеянне на ўсё грамадства і на маё асабістае жыццё.

Янка Скрыган — пісьменнік надзвычайнага лёсу, які не пазбегнуў крыўды і трагізму, але назаўсёды застаўся зачараваны людзьмі. Пісаць для яго было тое ж самае, што зразумець чалавека, дапамагчы яму. А дапамагаў ён усім, хто імкнуўся вучыцца, духоўна ўзвысіцца, прычым, у самых розных формах. У замалёўцы "Дысертацыя", змешчанай у кнізе "Некалькі хвілін чужога жыцця" (Мн., 1979. С. 218), Янка Скрыган піша: "Я быў неафіцыйным апанентам у чалавека, які абараняў дысертацыю на годнасць кандыдата гістарычных навук. Пасля ён папрасіў — ці не змагу я накідаць сваю прамову на паперку, бо яе трэба далучыць як дакумент да абароны.

Назаўтра па тэлефоне я запытаў, дзе ён жыве, сказаўшы, што збіраюся рабіць праходку, дык заадно прынясу яму і тую паперку.

Я ўбачыў іх — малады хлапчына і яго маладая жонка. Яны ўгаварылі зайсці на хвілінку да іх.

Пасля, пад вечар ужо, яны праводзілі мяне дадому. Па дарозе мы гаварылі ўсё пра яго ж дысертацыю, часамі нават спыняліся, калі гаворка патрабавала нейкіх экскурсаў. Ён распытваў пра тых, каго не паспеў убачыць — Платона Галавача, Васіля Каваля: той час быў тэмаю яго даследавання".

Прызнаюся, у мяне нават у думках не было, што факт абароны маёй дысертацыі Янка Скрыган выкарыстае ў сваёй замалёўцы. Упершыню ўбачыўшы яе ў кнізе "Круги", я збянтэжыўся. Скрыгана, відаць, задаволіла тое, што ў нас не забываюць першага паслярэвалюцыйнага пакалення пісьменнікаў, вывучаюць яго жыццё і творчасць, гісторыю літаратуры і журналістыкі.



Ян Скрыган з першай жонкай Лінай. 1936 г.

* * *

Дзіўна — спачатку я асабіста пазнаёміўся з Янкам Скрыганам, а потым з яго кнігамі. Калі я вывучаў у школе беларускую літаратуру, ён хадзіў яшчэ ў "ворагах народа", і наш настаўнік нават не ўзгадваў яго імя. Пасля арміі, працуючы ў Мінску, нейкі час я быў камсоргам будтрэста № 4, адчуў, як цягнецца моладзь да беларускай літаратуры. Арганізаваў у інтэрнаце літаратурны вечар з удзелам Міхася Лынькова, які стаў сапраўдным святам для маладых будаўнікоў.

А потым запрасілі гасцей у рабочы інтэрнат па вуліцы Брылеўскай. У маёй інфармацыі, надрукаванай у газеце "ЛіМ", ёсць такія радкі: "У нядзелю а дваццатай гадзіне прыйшлі празаікі Піліп Пестрак, Янка Скрыган, Тарас Хадкевіч, Іван Мележ і паэт Станіслаў Шушкевіч..." Усіх пісьменнікаў тады, у снежні 1959 года, я ўбачыў упершыню. Усе яны выступалі, як кажуць,

цікава і змястоўна. Але ж мне больш за ўсіх запомніўся на першы погляд ціхі і непрыкметны Янка Скрыган. А сакрэт быў просты — у той час усе рабочыя зачытваліся апавяданнем Скрыгана "Наталля". Янка Скрыган ахвотна расказваў, як працаваў над гэтым творам, што ў ім біяграфічнага. Гаварыў не спяшаючыся, разважліва, і надта ж прыгожа гучалі яго словы ў правільным беларускім вымаўленні. Пасля Скрыган раскрыў неабходныя старонкі свайго зборніка і пачаў выразна і мілагучна чытаць:

— А як жа будуць жыць людзі без яе, як будуць гаварыць, думаць, смяяцца ці плакаць, спяваць песні, нешта рабіць, нечага дамагацца, нечага бясконца хацець? Як жа гэта яна не ведацьме ўсяго таго, што называецца жыццём, што з кожным днём мяняецца, іначае, каб усё лепшаць і харашэць? Як жа гэта яна не будзе думаць, не будзе сярод людзей?

Моладзь любіць, калі ёй чытаюць самі аўтары. Здаралася, Скрыган чытаў сваё напісанае Якубу Коласу, Кузьму Чорнаму, а цяпер ён чытае будаўнікам, мантажнікам, учарашнім дзесяцікласнікам, студэнтам вячэрніх і завочных аддзяленняў. І яны горача пляскалі ў далоні.

Тады ж на тытульным лісце свайго зборніка "Апавяданні" (Мн., 1956) ён уласнаручна напісаў: "Эдуарду Карніловічу на час нашай сустрэчы. Ян Скрыган. 20.XII.59".

Шмат бачыцца з Янкам Скрыганам мне не выпадала. Але калі па прапанове загадчыка кафедры гісторыі журналістыкі Рыгора Васільевіча Булацкага мне зацвердзілі тэму дысертацыі аб грамадска-палітычнай і рэдактарскай дзейнасці Платона Галавача, патрэба ў пісьменніку, жывым сведку той пары значна ўзрасла.

Як самае дарагое жыве ў маёй памяці тое, як я праз вобраз Я. Скрыгана, яго светаразуменне і думкі, яго адносіны да свайго часу спазнаваў Платона Галавача.

Памятная пліта ў г. Кіўілі (Эстонія) дзе пісьменнік працаваў галоўным бухгалтарам на сланцахімічным камбінаце ў 1948-1949 гг.

Янка Скрыган за будучыню сваёй Бацькаўшчыны, за духоўнае адзінства нацыі, за патрыятычнае выхаванне маладога пакалення. У тканіну сваіх твораў ён уплятаў столькі брыльянтаў думак, што яго можна назваць пісьменнікам, якому ўласціва дэмакратычнае мысленне. Гэтае меркаванне мне дапамагае замацаваць выдатны французскі філосаф і пісьменнік Шарль Мантэск'е, які сцвярджаў: "Прынцыпам дэмакратыі з'яўляецца дабрачыннасць, так як грамадзянамі кіруе пачуццё любві да бацькаўшчыны і роўнасці..." Усё, што ў сваім жыцці рабіў Янка Скрыган: штосьці ўсхваляў у газеце, пісаў мастацкія гуманістычныя творы, прыгожа выступаў перад чытачамі, дапамагаў выводзіць моладзь у свет — гэта і ёсць сапраўдная дабрачыннасць, аб якой ведалі ўсе, хто меў да яго дачыненне. І

У часопісе "Полымя". Ян Скрыган, Алесь Бачыла, Іван Чыгрынаў, Іван Пташнікаў, Анатоль Вялюгін, Анатоль Клышка і Рыгор Шкраба. 1965 г.

Ці трэба пісьменніку дапамагаць аспіранту? Гэта ж немалая і даволі складаная праца. Я шмат думаў яшчэ і аб тым, што ў гэтым выпадку Скрыган як жывы сведка станавіўся найкаштоўнейшым "дакументам" гісторыі і лепш за яго не можа даць інфармацыю ніхто, ні аспірант, ні нават вучоны. Тры невялічкія лісткі, спісаныя рукой Янкі Скрыгана, дапамаглі мне, ды і цяпер, праз шмат год, сагреваюць маё сэрца. Я захоўваю іх, як дарагую рэліквію, як успамін аб таленавітым і неабыякавым да іншых пісьменнікаў.

Каб адчуць духоўна-палітычную атмасферу, у якой жылі амаль аднагодкі П. Галавач і Я. Скрыган, я ўважліва чытаў іх творы, мастацкія і публіцыстычныя. Першы ўжо нічога не мог пра сябе сказаць, а другі вярнуўся з вандровак і плённа працаваў. Тады я, можа, як ніколі, адчуў боль незваротнай страты і хвалюючае шчымліва прыемнае задавальненне ад таго, што пісьменнік жыве і духоўна ўзбагачае суайчыннікаў, што ён ідзе насустрач людскім жаданням і патрэбам, што ён можа дапамагчы.

Адчуў я і тое, як шчыра перажываў ўсё, што рабіў людзям, ён рабіў добраахвотна і добрасумленна; не для таго, каб заслужыць падзяку, а каб знішчыць крыўду, аблегчыць становішча чалавека, узняць яго настрой.

Калі ў мяне ўсё было падрыхтавана, я паведаміў Скрыгану пра час абароны маёй дысертацыі. Ён гэта добра ўспрыняў і на развітанне сказаў:

— Я абавязкова прыйду на абарону і скажу некалькі слоў. Платона Галавача я добра ведаў і многа чым яму абавязаны. Шкада таленавітага чалавека, які яшчэ шмат мог бы зрабіць.

Так, пісьменнік не пісаў дысертацыі, а на абарону з'явіўся. Яго дысертацыя — гэта яго творы, яго выверанае слова, якое абараняе чалавека ад памылак і самападману, дапамагае зразумець праўду жыцця, ачышчаць і яднаць людскія душы. Незабыўны Янка Скрыган жыве ў маім сэрцы як сапраўдны беларускі пісьменнік і чалавек — спагадлівы, дружалюбны, добразычлівы, вытрыманы, мудры. Як тонкі летапісец характару самабытнага народа і яго гісторыі.

Эдуард КАРНІЛОВІЧ,
кандыдат гістарычных навук

Па запрашэнні Лепельскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, дзе дырэктарам працуе руплівая Ірына Тарасава, пабывалі намеснік галоўнага рэдактара часопіса "Нёман" Міхась Пазнякоў і даўні аўтар гэтага выдання (друкуецца з 1976 г.) Ганад Чарказян. Сталічныя пісьменнікі сустрэліся з начальнікам ідэалагічнага аддзела Лепельскага райвыканкама Ігарам Урбанам. Адбылася зацікаўленая размова аб супрацоўніцтве паміж установамі Лепельшчыны і рэдакцыяй часопіса "Нёман", аб выданнях РВУ "Літаратура і Мастацтва" і падпісцы на іх.

Дзень «Нёмана» ў Лепелі

Дарэчы, Лепельскі раён сярод рэгіёнаў Віцебшчыны займае чацвёртае месца па падпісцы на літаратурна-мастацкія і грамадска-палітычныя выданні РВУ, а па падпісцы на "Нёман" і ўвогуле — другое, саступаючы толькі Віцебску. Аднак, як зазначыў у час перамоў з кіраўніком аддзела І. Урбанам М. Пазнякоў, з кожным кварталам падпіска на дзяржаўныя літаратурна-мастацкія і грамадска-палітычныя выданні ў раёне чамусьці паступова змяншаецца. Такая карціна назіраецца і па іншых рэгіёнах краіны, што зусім недапушчальна. Між іншым, Пратаколам даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (№ 2 ад 16.01.2004 г.) на сустрэчы з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі прадугледжана наступнае: "Аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму сумесна з Міністэрствам культуры, Міністэрствам адукацыі арганізаваць падпіску на перыядычныя выданні Рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва" (часопісы "Нёман", "Полымя", "Маладосць", "Всемирная литература", газета "Літаратура і мастацтва") усімі гарадскімі, раённымі, пасялковымі і сельскімі публічнымі бібліятэкамі і бібліятэкамі ўстаноў адукацыі". І, вядома, закрываць вочы на даручэнне кіраўніка дзяржавы, мякка кажучы, можа толькі той, хто не разумее сутнасці вялікай дзяржаўнай справы. Добра, што ў Лепельскім райвыканкаме правільна ацэньваюць сітуацыю.

Затым у памяшканні цэнтральнай раённай бібліятэкі адбылося літаратурнае свята, прымеркаванае да 60-годдзя часопіса "Нёман". Між іншым, у 2007 г. бібліятэка адзначыць свой стогадовы юбілей. Сёння фонд бібліятэкі складае звыш 55 тысяч экземпляраў, бібліятэкарамі абслугоўваецца штогод амаль пяць тысяч чытачоў, праводзіцца значная асветніцкая і культурна-масавая работа. Да таго ж, ЦРБ — галоўная ў сістэме раённых бібліятэк, сярод якіх дзіцячая і 23 сельскія бібліятэкі-філіялы. Агульны фонд Лепельскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы — звыш 248 тысяч экземпляраў. За год яны абслугоўваюць амаль 9 тысяч чытачоў. За 2004 г. імі ажыццёўлена 133 501 выдача часопісаў (кніг — 146 604 выдачы). І яшчэ адзін немалаважны факт: бібліятэка выпісвае амаль 8 тысяч экземпляраў газет і часопісаў (242 найменні).На выданні РВУ "Літаратура і Мастацтва" існуе вялікі попыт, аднак не хапае сродкаў, каб павялічыць падпіску.

У актавай зале бібліятэкі на гэты раз сабраліся і горача віталі гасцей з Мінска навучэнцы Дзяржаўнага ліцэя, члены раённага народнага літаратурна-музычнага клуба "Выток", бібліятэкары горада, школьнікі, чытачы. У зале была размешчана выстаўка нумароў часопіса "Нёман" за розныя гады і твораў запрошаных пісьменнікаў. Вядучая літаратурнага свята Ганна Васілеўская расказала пра гісторыю "Нёмана". Затым "адбылася экскурсія" па найбольш адметных публікацыях за апошнія два гады, дзе зазначалася, што "Нёман" друкуе не толькі найбольш таленавітых празаікаў, паэтаў, літаратуразнаўцаў і крытыкаў, але і вялікую ўвагу надае надзённай, шматпланавай і вельмі запатрабаванай публіцыстыцы.

Са сваімі вершамі на свяце выступілі мясцовыя літаратары. Пасля слова было дадзена гасцям з Мінска. Яны шмат гаварылі аб літаратурным працэсе, творчым жыцці, прачыталі свае творы, адказалі на пытанні, падаравалі бібліятэцы ўласныя кнігі з аўтографамі. Міхась Пазнякоў пазнаёміў прысутных з планамі рэдакцыі часопіса "Нёман" на наступны год. Ён таксама выступіў па мясцовым тэлебачанні, якое зацікавілася гэтай падзеяй у культурным жыцці Лепеля.

Міхась ЖУРАВІНА

Фота Ганада Чарказяна

Праўда пра вайну — доўг памяці

Дзве адметныя падзеі культурнага жыцця адбыліся ў Брэсце ў адзін і той жа дзень. У межах міжнароднага тэатральнага фестывалю "Белая вежа" паказаны ў тэатры драмы і музыкі спектакль "Мост" паводле аповесці Васіля Быкава "Круглянскі мост". А ў педуніверсітэце прайшла прэзентацыя кнігі "Доўг памяці" Уладзіміра Калесніка. Падзеі самадастатковыя, ды што цікава: праходзячы паралельна, яны пэўным чынам перасякаліся. Перад паказам спектакля гледачам паведамілі, што ён прысвячаецца Уладзіміру Калесніку. А ўдзельнікі прэзентацыі названае кнігі ў Навукова-асветным цэнтры імя У.А. Калесніка выказалі напрыканцы імпрэзы рашэнне вылучыць спектакль "Мост", ажыццёўлены Брэсцкім тэатрам драмы і музыкі, на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

Такое перапляценне падзей адбылося ўпершыню. Ды невыпадкова. Абодва пісьменнікі — Быкаў і Калеснік — прайшлі пекла вялікай вайны: першы ў рэгулярных войсках, другі ў партызанах. Васіль Быкаў, як вядома, пасля сутыкнення ў жорсткім баі з немцамі быў памылкова занесены ў спіс загінуўшых. Уладзімір Калеснік — двойчы паранены. Быкаў упершыню ў беларускай літаратуры пачаў паказваць у сваіх творах горкую праўду пра вайну. Яшчэ ў 1968 годзе, да з'яўлення знакамітай аповесці "Мёртвым не баліць", у "Круглянскім мосце" стварыў вобраз нягодніка Брытвіна, былога ротнага, які ў партызанах на правах выконваючага абавязкі камандзіра атрада пасылае ўзрываць мост падлетка Міцю і юнака Сцёпку, а сам хаваецца ў лесе, што, дарэчы, пераканаўча адлюстраваў спектакль "Мост" (сцэнічны варыянт і пастаноўка заслужанага дзеяча мастацтваў А. Казака). Калесніка дагэтуль мы ведалі як таленавітага і па-быкаўску смелага ў крытыцы і літаратуразнаўстве. А ў сваёй апошнай кнізе "Доўг памяці", што 11 гадоў праляжала, чакаючы выхаду, і якую Янка Брыль назваў у прадмове "таленавіта-змястоўнай кнігай-помнікам", няўрымслівы творца паказаў нам не аднаго, а нават некалькі баязлівых і подлых партызанскіх важакоў, кар'ерыстаў, сярод якіх асабліва вылучаецца камбрыг Ключко. У гэтай гранічна шчырай і духоўна багатай спавядальнай аповесці Уладзімір Калеснік з вострым сардэчным болем распавядае пра смерць многіх юных змагароў, страту адзінай і непараўнанай сяброўкі Зіны Маслоўскай, якой і прысвечана кніга, а перадусім падае шырокую панараму жыцця найперш роднае вёскі Сіняўская Слабада, стварае мноства яскравых вобразаў сялян, настаўнікаў, родзічаў, партызан.

Падагульняючы сказанае, хачу назваць "Доўг памяці" У. Калесніка і "Круглянскі мост" В. Быкава, па якім пастаўлены спектакль, пабраціімамі.

Васіль ЖУКОВІЧ

ЦЯЧЭ РАКА ЛЯСНАЯ...

Нарэшце гэтае цудоўнае асенняе свята — Свята Пісьменства — завітала і ў старажытны Камянец, што знаходзіцца на Берасцейшчыне, стаіць на рацэ Лясной. Сёння Камянец прымае, пад засенню сваёй Белай вежы, гасцей з усёй Беларусі, успамінае мінулае, даўнія векапомныя традыцыі, паказвае сучасныя дасягненні — усё, чым хата багата. Прыгожае свята! Да яго рыхтаваўся, дарэчы, не толькі Камянец, не толькі Брэсцкая вобласць, але і ўся краіна, асабліва сталіца — Мінск. З аднаго боку, свята мясцовае, рэгіянальнае, з другога — агульнанацыянальнае, дзяржаўнае, у якім арганічна паядналіся духоўнае і свецкае, гісторыя і сучаснасць, асабовае і грамадское. У гэтым яго харастро і прывабнасць.

Сталічнае выдавецтва "Мастацкая літаратура" выдала, спецыяльна прымеркаваную да свята, кнігу "Песні Белавежы: Камянеччына літаратурная". Гэтая своеасаблівая анталогія сабрала пад адным дахам пісьменнікаў, жыццё і дзейнасць якіх так ці інакш звязана з Камянеччынай, з Белавежскай пушчай, гісторыяй і прыгажосцю гэтага краю. Часавы абсяг шырокі: ад Іпація Пацея, Міхала Карповіча да тых, хто сёння толькі пачынае, робіць першыя крокі ў літаратуры: проза, паэзія, публіцыстыка і бясконцая шматстайнасць творчых індывідуальнасцей. Сярод аўтараў — славуты паэт-лацініст XV—XVI стст, Мікола Гусоўскі, пісьменнік-мемуарыст XVIII ст. Марцін Матушэвіч, апошні Вялікі князь літоўскі і кароль польскі Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, наноў адкрыўшы сёння пісьменнік-святар Плакід Янкоўскі, рускія пісьменнікі Мікалай Ляскоў і Павел Шпілеўскі, мясцовы ўраджэнец гісторык Усевалад Ігнатоўскі, народныя паэты Беларусі Янка Купала і Якуб Колас, Аркадзь Куляшоў і Пімен Панчанка, незабыўны Уладзімір Калеснік, паэты-берасцейцы Мікола Засім, Міхась Рудкоўскі, Мікола Пракаповіч, Васіль Жуковіч, Зінаіда Дудзюк (укладальніца гэтага зборніка), Ніна Гарагляд, Ярына Дашына, Галіна Новік, Людміла Лойкуц, вядомыя краязнаўцы Вера Ляшук і Георгій Мусевіч, а таксама многія іншыя. Усіх не пералічыш.

Выданне падарункавае, але ў ім ёсць вялікі і сур'ёзны сэнс — больш пільна і ўдумліва паўзірацца ў зямлю Камянеччыны, узнавіць яе гераічную славу, кінуць позірк у дзень заўтрашні.

Заканамерна, што структурна зборнік складаецца з трох раздзелаў: "Запаветы продкаў", "Зачараваныя вандроўнікі", "Тут Радзімы пачатак, выток..." — і кожны раздзел па-свойму цікавы ў сваім аповедзе пра гісторыю краю, асаблівасці прыроднага свету, пра тутэйшы народ, яго духоўныя шляхі — пошукі, норавы і ўяўленні.

Літаратурныя тэксты, змешчаныя ў кнізе, па-добраму ўражваюць. Як вядома, фенаменальная здольнасць культуры і мастацтва, у тым ліку і літаратуры, — перадаваць воблік часу, аберагаць чалавечую памяць, урокі мінулага і повязь з ім. Пра гэта думаеш, гартаючы старонкі "Камянеччыны літаратурнай", у прыватнасці тыя, на якіх змешчана некалькі раздзелаў з "Песні пра зубра" М. Гусоўскага.

Пра Белую вежу (Камянецкі стоўп) у "Песні пра зубра" не гаворыцца нічога, але паэт пра яе напэўна ж ведаў. Так ці інакш, паэма М. Гусоўскага дасканаласцю сваёй канструкцыі і паэтыкай нагадвае Белую вежу, і ёсць нешта агульнае паміж гэтымі манументальнымі вобразамі — пушчанскага зубра ў творы Гусоўскага і Камянецкай Белай вежай.

Сапраўдная літаратура заўсёды перарастае межы існавання асобнага чалавека, ўсеагульная, яна мае сілу імператыва. Думаецца, што гэтую ісціну добра ўсведамляў Плакід Янкоўскі (нарадзіўся ў вёсцы Вайская, што недалёка ад Камянца, у 1810 годзе) — паэт і празаік, святар. Ён таксама прадстаўлены ў зборніку некаторымі сваімі творамі ("Шчасце", "Наіўнасць", "Ніхто, як Бог"...), у якіх відаць цікавасць аўтара да ўнутранага свету чалавека, да матывуючых арыенціраў яго паводзін. П. Янкоўскі, як пісьменнік і святар, вучыў людзей тым маральна-этычным прынцыпам, якімі яны павінны кіравацца ў жыцці: "Не пажадай бліжняму свайму таго, чаго не жадаеш сабе", "Не капай пад іншым ямы, каб не ўваліцца ў яе самому", "Паміраеш, а жыта сей" і інш. Што і казаць — гэта надзейныя, несастарэлыя архетыпы паводзін чалавека.

У гэтай кнізе сутыкаюцца часы. Побач з "Песняй пра зубра", праз старонку якую, урывак з рамана рускага пісьменніка XIX стагоддзя Мікалая Ляскова "Некуда", якому таксама здаралася наведваць гэтую зямлю — Камянеччыну. Паводле свайго характару гэта быў нястомны вандроўнік у свет народнага жыцця. У яго ёсць нават аповесць "Очарованный странник" — назва якой стала, дарэчы, найменнем для аднаго з раздзелаў зборніка "Песні Белавежы". Па службовых справах і абавязках ён шмат ездзіў па тагачаснай расійскай імперыі, углядаўся ў жыццё, запамінаў. Пабываў і ў Белавежскай пушчы — атрымаў вялікае, незабыўнае ўражанне. Зацікавіўся паўстаннем 1863 — 1864 гадоў на Беларусі і ў Літве. Падзеям гэтага паўстання, якія адбываліся ў Белавежскай пушчы, і яго ўдзельнікам прысвечаны старонкі рамана "Некуда".

Важка гучаць у зборніку вершы класікаў — Купалы і Коласа.

Камянеччына літаратурная прадстаўлена рознымі перыядамі сваёй гісторыі. Тут у гады Вялікай Айчыннай вайны партызаніў Мікола Засім —вядомы на Берасцейшчыне паэт. Добра зрабіла ўкладальніца, змясціўшы яго верш "Заклік", напісаны ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Выдатны верш! Помніцца, што яго любіў знакаміты і ўплывовы крытык Рыгор Бярозкін. Любіў, як ён казаў, за праўдзівы паказ тактыкі партызанскай барацьбы, якая ў гады вайны разгарэлася і на тэрыторыі Камянеччыны:

А кулак наш, як жалеза,
Грудзь шырокая, што печ,
Дый пад бокам Белавежа, —
Можна ўдарыць, можна ўцеч.

"За гэтыя радкі, — казаў Рыгор Саламонавіч, — я аддаў бы ўсю творчасць..." — і ён называў прозвішча аднаго сучаснага беларускага паэта, чые творы залішне разыходзіліся з праўдзівым паказам жыцця.

Не раз звяртаўся да белавежскай тэмы Максім Танк. Шматгалосна і разнапланава гучыць верш "Дуб Ягелы". Сапраўды, такое дрэва — "дуб Ягелы" — расло ў Белавежскай пушчы, стаяла там некалькі стагоддзяў і ўпала не так даўно, у наш час. Газеты пісалі: "/Белавежскі дуб Ягелы / У навальнічную ноч / Свой закончыў век..." Вось якое апісанне яго пахавання дае паэт:

Шкада, што я не быў
На яго пахаванні,
Не чуў развітальных прамоў
Дзятлоў,



Якія яго столькі год лячылі,
Дзікоў,
Што ласаваліся яго жалудамі,
Зуброў,
Што на ім вастрылі свае рогі,
Буслоў,
Што калыхаў ён на сваіх руках,
Рыдання грузавікоў,
Якія яго везлі
На тартак.

Я, як homopoliticus,
Калісьці ўгаворваў яго
Падзяліцца сваімі ўспамінамі
Аб мінулых вяках і падзеях.

Пэўна, забыў стары.
А цяпер будуць розныя гісторыкі
Прыпісваць яму неверагодныя небыліцы,
Хоць ён больш за ўсё клапаціўся
Каб навокал яго прарасталі
Жалуды праўды.

Есць у гэтым вершы, думаецца, не толькі гістарычны, але і аўтабіяграфічны план, асабліва ў тых заключных радках, дзе гаворка ідзе пра "жалуды праўды".

Белавежская пушча адорвала і адорвае паэтаў высокім натхненнем і глыбокімі перажываннямі, выклікае на роздум над жыццём, яго маральнымі аспектамі. Драматычным роздумам, яднаннем з прыродай прасякнуты наскрозь лірычны верш Аркадзя Куляшова "Глыбокі лістапад у Белавежы..."

Вакол мяне —
направа і налева —
Лісты, лісты, лісты
заслалі шлях.
Пакуль яшчэ
не замялі іх сцюжы,
Пакуль ляжаць
духмянаю капой,
Хачу я, нібы ў вір,
заткнуўшы вушы,
У скаргу іх
зарыцца з галавой.

У дыялогу-яднанні з прыродай, з пракаветнай пушчай пясняр шукаў паратунку ад афіцыйнай прапаганды, маны, бязрадаснай сітуацыі застою.

Камянецкая тэма блізкая і паэтам маладзейшых пакаленняў. Вядома, моцы і звонкасці лацініста Гусоўскага Міколы ім, магчыма, і не стае, але душэўнасці, цеплыні, праніклівасці ў іх творах хапае. Задушэўна і даверліва гучаць, напрыклад, радкі Васіля Жуковіча, які з'яўляецца ўраджэнцам гэтай мясціны (нарадзіўся на хутары Забалацце паблізу Камянца). Шмат твораў прысвяціў паэт сваёй радзіме, адзін з іх — верш "Рэчка Лясная", які, побач з іншымі, увайшоў у зборнік.

Сціплая рэчка Лясная, на якой стаіць старажытны Камянец, паводле паэтавай логікі і на самай справе, папраўдзе, упадае ў вялікі акіян, дорачы яму зіхоткую чысціню белавежскіх крыніц. Так, відаць, адбываецца і з багаццямі культуры, мастацтва, літаратуры: лепшае, таленавітае з рэгіянальнага ўліваецца ў нацыянальнае, нацыянальнае — у агульналюдскае, агульначалавечае.

З паэтаў маладзейшых пакаленняў добрае ўражанне распрацоўкай камянецкай тэмы пакідаюць вершы М. Рудкоўскага, Я. Янішчыц, Н. Гарагляд, В. Гардзея... Таленавіта прадстаўлены Мікола Пракаповіч, асабліва вылучаецца яго верш "Вяртанне пушчанскага Ваўка" прысвечаны вядомаму нашаму гісторыку Усеваладу Ігнатоўскаму. "Воўк" — было партыйным псеўданімам У. Ігнатоўскага, які з'яўляецца лірычным героем гэтага твора і глыбока раскрывае сваё ўнутранае, духоўнае "я".

Арганічна дапаўняюць гэтую арыгінальную кнігу гісторыка-літаратурныя, публіцыстычныя і краязнаўчыя матэрыялы Уладзіміра Калесніка, Веры Ляшук, Георгія Мусевіча і інш.

Кніга "Песні Белавежы: Камянеччына літаратурная" пераканальна сведчыць, што ў беларускай літаратуры — уся наша нацыянальная гісторыя. І калі размова заходзіць пра стварэнне сучаснага аблічча беларускай нацыі XXI стагоддзя, выхаванне пачуцця гуманнасці і патрыятызму, дык зусім ясна, што гэта немагчыма без дзейснага ўдзелу літаратуры, мастацтва, духоўнай культуры, якія займаюць традыцыйна значнае месца ў выхаваўчым працэсе. У гэтай вялікай, адказнай рабоце на роўных прымаюць удзел і мінулае, і сучаснасць. Сёння мы па-новаму адкрываем для сябе тую гістарычную ісціну, што нягледзячы на вельмі складаныя сацыяльна-палітычныя ўмовы шматвекавога гістарычнага жыцця, таленавіты беларускі народ здолеў вылучыць з свайго асяроддзя шмат выдатных вучоных, пісьменнікаў, дзеячаў культуры і мастацтва, якія ўнеслі істотны ўклад у еўрапейскую цывілізацыю. Адна з найбольш багатых у славянскім свеце і наша літаратурная спадчына, якая ўключае творы высокага ўзроўню. Выхаванне высокаадукаванага, усебакова развітага, духоўна багатага чалавека немагчыма без глыбокага засваення найбольш каштоўнага з гэтай спадчыны.

Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ

ФРАНКА-БЕЛАРУСКАЕ «СВЯТА ЧЫТАННЯ-2005»

У кастрычніку ў перапоўненай актавай зале абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна адбылося адкрыццё тыдня "Свята Чытання-2005". Гэта традыцыйны сумесны французска-беларускі праект. Штогод "Свята чытання" праводзіцца ў розных краінах свету, яго ладзіць Міністэрства культуры і сувязі Францыі. У Беларусі свята арганізуецца Пасольствам гэтай краіны.

На працягу апошніх 17 год мерапрыемствы праходзілі на 5 кантынентах у 90 краінах планеты. Франка-беларуская акцыя праходзіла 11-ты раз. У 2003 годзе сюды прыязджаў лаўрэат Ганкураўскай прэміі, франка-беларускай літаратурнай прэміі, іншых міжнародных узнагарод Андрэй Макін. У той час пачаў працаваць маладзёжны клуб аматараў французскага літаратурнага слова "Кракалір". Летась Беларусь наведала лаўрэат франка-беларускай прэміі Лейла Себар. Сёлета былі запрошаны французскі літаратар, лаўрэат 3-й літаратурнай франкафоннай прэміі Таар Бен Жэлун, выкладчыца эстэтыкі Універсітэта Марка Блоша (Страсбург) Мары-Ан Лэскурэ.

На думку арганізатараў свята з'яўляецца «асаблівым момантам дыялога і выражэння культурнай разнастайнасці". Усе, хто жадае, могуць абмеркаваць прачытаныя творы французскіх аўтараў, разам далучыцца да пісьменства і літаратурнай творчасці. Удзельнікі імкнуцца прыцягнуць увагу да культуры краіны розных людзей, у тым ліку тых, хто мала цікавіцца літаратурай.

У праграме свята адбылася вялікая колькасць розных мерапрыемстваў. Так, у межах міжнароднай навуковай канферэнцыі "Мастацтва і філасофія", што праводзілася ў БДУ, прагучала выступленне Мары-Ан Лэскурэ, прысвечанае творчасці Жана-Поля Сартра і Эмануэля Левінаса. Тэмай выступлення было пытанне "Што філасофія значыць для мастацтва". Канферэнцыю арганізавалі факультэт філасофіі, кафедра мастацтваў універсітэта, Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА ў Рэспубліцы Беларусь, Пасольства Францыі ў Рэспубліцы Беларусь. Актуальныя пытанні культуры выносіліся на розныя семінары, "круглыя сталы". Гэта і мастацтва ў філасофскім дыскурсе XX стагоддзя, суадносіны мастацтва, філасофіі і віртуальнага, літаратуры і ідэалогіі. У межах праекта адбылося пасяджэнне клуба юных чытачоў "Кракалір", атэльле чытання "Французская мова і вялікія ідэі", выкананне на французскай мове п'есы Сартра вучнямі 74-й мінскай гімназіі.

Па словах дырэктара абласной бібліятэкі Наталлі Чуевай, адной з асноўных мэтаў мерапрыемства з'яўляецца далучэнне карыстальніка бібліятэкі да духоўных каштоўнасцей Францыі.

Алесь ТУРОВІЧ

Сённяшні перыяд станаўлення маладой унітарнай беларускай дзяржаўнасці, якая будуецца на разарванай метаплатформе былой звышкраіны, нагадвае сабой працэс экзістэнцыйнага існавання. Хаатычны дрэйф расколін былой сацыяльна-палітычнай *"пліты"* суправаджаецца магутным шлейфам ідэйна-аксіялагічнага, сацыяльна-эканамічнага і мастацкага засваення ўсіх актуалізаваных субстанцый рэчаіснасці. У анталагічным плане такая рэальнасць паўстае як своеасаблівая яма, прагал, што існуе ў *"прасвеце быцця"*, калі чалавек вымушаны тэрмінова знаходзіць сродкі і сілы, каб не трапіць у гэтае прадонне, а трапіўшы не застацца ў ім надоўга, годна і пэўна адказаць на пытанне трагічнага шэкспіраўскага прынца Гамлета — *"Быць ці не быць?"*.

ПОШУК ПРАСТОРЫ БЫЦЦЯ
ў сучаснай беларускай прозе

Калі прыняць на веру слушную думку вядомага філосафа В. Біблера, які сцвярджае, што класічна вызначальнае "быць ці не быць?" *"ёсць толькі фіксацыяй, якая адразае бясконцую дэтэрмінацыю* **(прызнанне агульнай аб'ектыўнасці ўсіх з'яў прыроды і грамадства, вызначаных законамі навукі — І. Ш.)** *пачаткам жыццёвага, біяграфічнага "працяжніка", так званым тэрмінам жыцця для сярэднявечнага індывіда, то ў трагедыі сучаснага індывіда гэты пачатак нічога не пачынае, а замкнуты "сам на сабе"*. Адсюль можна канстатаваць, што сучаснік у нашы дні апынуўся ў прасторы быційнага прагалу, а гэта патрабуе, каб ён не проста прыглядаўся і прыстасоўваўся да быцця, а ствараў яго. *"Сучасны чалавек*, — працягвае сваю думку В. Біблер, — *заўсёды — і ў жыцці, і ў свядомасці — вымушаны балансаваць у "варонцы" абсалютнага пачатку — адначасна ўнутры і звонку "свайго свету", у заўсёдным пярэдадні свайго быцця ці небыцця. Яго быццё заўсёды толькі магчымае. І толькі пры такой невызначальнасці — пастаянае"*. Напэўна, *"свой свет"* індывіда-беларуса, які на цяперашнім этапе апынуўся пад ціскам знешніх і ўнутраных калізій і канфліктаў, таксама з'яўляецца зыходнай маральна-духоўнай асновай у яго стваральным дзеянні.

У перыпетыях нашага часу з асаблівай сілай сцягваюцца да тоеснасці і штохвілінна з такой жа сілай адштурхоўваюцца адзін ад аднаго амаль усе субстанцыяльныя рэчы і антыномії свету. Вызначальным, на нашу думку, сацыяльна-ментальным феноменам для сённяшняга беларуса з'яўляецца адчуванне перасцярогі і палахлівасці, з прычыны таго, што ён выштурхнуты са сваёй звыклай сацыяльна-псіхалагічнай "нішы", на мяжу той умоўнай лініі хаосу і космасу, якая правакуе экзістэнцыйную прастору месца пачатку *"тут і зараз"*. Такая дамінантная зададзенасць моманту ў пэўным сэнсе фарміруе паэтыку і эстэтыку беларускай мастацкай прозы сучаснасці.

Найбольш адэкватнай структурна-паэтычнай дылемай, якая прыадкрывае развіццё новай мастацкай прозы, на нашу думку, магла б стаць "кантамінацыя-расцяжка" канцэпта *"нямата-крык"*, дзе пад канцэптам мы разумеем пэўную мадэльную арганізацыю для вылучэння цэласнага спосабу бачання рэальнасці.

Справа ў тым, што высілкі сучасных беларускіх празаікаў у стварэнні герояў нашага часу, шмат у чым нагадваюць біялагічна-медыцынскі працэс нараджэння дзіцяці. Як вядома, вучоныя-акушэры лічаць, што псіхафізічная траўма, якая іншы раз наносіцца немаўляці падчас родаў, з'яўляецца самай страшнай для будучага падсвядомага існавання чалавека. Таму дактары рэкамендуюць дамагацца змяншэння шокавага трагічнага эфекту дадзенага моманту, прапаноўваючы розныя варыянты, напрыклад, праводзіць роды ў вадзе, ці раяць як мага хутчэй пасля прынядцця родаў вяртаць нованароджанага да цела маці. У культуралагічна-сацыяльным плане падобную ролю адаптыўна-анестэзійнага характару і павінна, нам думаецца, адыгрываць літаратура. Яна "жыватворнай вадой" уяўлення, фантазіі, міфа павінна шматстайна і поліфанічна-шматразова пераствараць мастацкую рэальнасць. Літаратура сімвалічна ўяўляецца той маланкай, якая не толькі асвятляе, але яшчэ і іанізуе паветра новай рэчаіснасці, узнаўляючы аналогію з немаўлём, і тым самым дапамагае чалавеку і грамадству зрабіць першы глыбокі ўздых і крык самазаяўлення.

Нам хацелася тут давесці, што паняцце дэтэрмінацыі мы не разглядаем толькі ў негатыўным плане, наадварот, творчасць шматлікіх сучасных пісьменнікаў імкнецца метадам рэфлексіі расплавіць сацыяльна-прыродную лінейнасць гісторыі, спрасаваную ў розных эстэтычна-мастацкіх стылях і плынях. І гэта заканамерна, бо разарваная сацыяльна-гістарычная прастора, маючы свае мінусы, у рэшце рэшт, дае і свае плюсы, становіцца прыдатным сродкам для розных метадалагічных падыходаў мастацка-эстэтычнага засваення.



Калаж В. Кавалёва

Каардыната "нематы" ў нашым выпадку звязваецца ў першую чаргу з момантам стварэння маральнай перыпетыі сённяшняга дня, дзе літаратурнаму герою не заўсёды надараецца магчымасць сказаць сваё слова, ці знайсці сваё "быційнае месца" ў духоўнай *варонцы* часу. Гэта пытанне, як мы лічым, апошнія два дзесяцігоддзі сур'ёзна займала В. Быкава. Героі яго аповесцей і апавяданняў нясуць у сабе магутны зарад рэфлектыўна-аналітычнай, прыроднай энергетыкі, яны надзеленыя вялікай прагай парывання да праўды жыцця, яе стваральнай прасторы, але няўмольна спыняюцца перад сцяной *"быційнага прагалу"*. Яны, быццам бы тая міфічная жонка Лота, — застываюць саляным слупам пры неспатольным жаданні і спробе азірнуцца назад. Ужо адны толькі назвы твораў: *"Сцяна"*, *"Труба"*, *"Балота"* — ствараюць размаітую сімволіку лабірынтнай прасторы ўладарства Мінатаўра. Замкнутая сацыяльна-гістарычная сфера, быццам *"балота-прорва"*, уцягвае ў сябе лёсы герояў, якія, пазбаўленыя ніці Арыядны, часткова страчваюць усялякую магчымасць штосьці зразумець пра сябе і акаляючы свет.

Існаванне лабірынта ў падобнай прасторы трагічнае, сыходзячы з самой сутнасці жыцця. У такой сітуацыі героі вядуць найчасцей хаатычнае, "нямое" існаванне, балансуючы толькі як матэрыяльнае цела, энергія якога, трапіўшы ў звышмагутны магнітна-сілавы ціск, замкнулася на сабе самой.

Найбольш яскрава паказаць прастору лабірынтнасці пісьменніку ўдалося ў творы "Труба", аналізуючы гаротна-трагічны лёс галоўнага героя Сарокіна. Вызначальнай становіцца сітуацыя і паводзіны ў ёй Валеры, калі ён, вяртаючыся з працы на падпітку, трапляе ў газаправодную трубу і пачынае ліхаманкава рухацца то ў адзін, то ў другі бок, а пасля ўжо спрабуе разважаць: *"І ўсё ж трэба паўзці. Куды? Хто яго ведае куды. Наперад... Калі б ён ведаў, дзе зад, а дзе перад, дзе выйсце — наперадзе ці ўзадзе? Ён падумаў — наперадзе. А можа быць, ззаду, і ён аддаляецца ад свайго паратунку? Во ў чым праблема. Хоць цяпер ён поўз толькі ў адным, наўгад абраным кірунку, ніякай упэўненасці ў ім не было"*. Далей аўтар свядома-падкрэслена прадаўжае аналіз дзеянняў героя ў прасторава-пачуццёвых параметрах на ўзроўні эмоцый і канстатацый. *"Нечакана ён заўважыў, што траса пайшла ўніз, паўзці па трубе стала зручней — пад невялікі плаўны ўхіл... Пакуль ён так думаў, упарта прабіраючыся наперад па шархоткай трубе, тая неўпрыкмет пайшла ўгару. Рухацца стала горш"*. Пісьменніку ўдаецца перадаць натуральны, жахлівы стан чалавека, які трапіў у безвыходнае становішча. Калапсіруючае мысленне героя прымушае яго, апроч кантролю за сваім фізічным дзеяннем, скрупулёзна шукаць і ўзнаўляць вузлавыя канфлікты свайго прамінулага жыцця, іх першапрычыны, а разам з тым і матывы першаштуршкоў, да асэнсавання якіх герою так хочацца прабіцца. Але гэтаму перашкаджае *"залішне чалавечае"* (паводле Ф. Ніцшэ), сацыяльна-эмацыйная і утылітарна-біялагічная яго сутнасць, якая, раз за разам, падштурхоўвае героя рухацца па лабірынце прасторы і часу. Колазварот у творы падаецца ў падвойным варыянце. Матэрыяльнае цела-абалонка рухаецца па трубе, а дрыготкая думка, па коле рэтраспектыўнай памяці. Спаянасць лабірынтных сфер відавочная, але аўтару ўдаецца "разарваць" гэтыя негатыўныя бясконцасці-сферы. Чалавеку, для таго каб адпавядаць свайму прызначэнню, трэба кожны раз пераўзыходзіць сябе. Вось да такога ўзвышэння і імкнецца, па волі аўтара, наш герой у апошняй стадыі свайго мройлівага сну: *"У канцы ён адчуў сябе пад нібыта крышталёвым скляпеннем вялізнае залы-палаца, поўнай людзей і святла — дабрыні. Прасветленыя, цярплівыя твары людзей былі звернуты ў бок подыума, дзе збіраўся гаварыць прамову Валера... Усе чакалі Валеравага слова, і Валера чакаў таксама. Але што ён павінен сказаць — не ведаў сам. Запаветнае слова павінна з'явіцца да яго аднекуль звыш, ён напружана чакае яго, каб вымавіць грамавым голасам, і тады адбудзецца штосьці. Штосьці неверагодна важнае і шчаслівае"*. Аднак герою не ўдаецца знайсці слова, бо пісьменнік перакананы, што яно не можа зляцець з вуснаў героя, які не назапасіў багатага духоўнага вопыту, а значыць, не стварыў пачуцця самапавагі да сябе і іншых. Вось чаму Валера Сарокін у канцы твора і *"сціскаецца, нібы растае ў прасторы"*. Прасторы *"нематы"* і прадоння.

Цяпер робіцца відавочным, што Быкаву, як нікому іншаму, удалося данесці ў сваіх творах неабходнасць *западання* нацыянальнай памяці ў іншую прасторавую *варонку*. Пісьменнік настойліва і пакутліва шукаў і асэнсоўваў патэнцыяльныя магчымасці сучаснай асобы, падрыхтаванай да здзяйснення гістарычна-адказнага ўчынка, усведамляючы пры гэтым, што ў наш час, калі перавернута шкала духоўных каштоўнасцей, знівеліравана пачуццё гонару і павагі чалавека да сябе. Пісьменнік сваімі творамі, нібы ўдарамі ў набат агалошваў, будзіў думку і сэрцы беларусаў — *"людзьмі звяша"*. Праз тупіковыя абставіны, найскладанейшыя, трагічныя канфлікты, у якія ён ставіў сваіх герояў, пісьменнік спадзяваўся, што грамадства зможа рэалізавацца толькі на грунце максімы Марціна Лютара: *"Стаю на тым і не магу інакш"*.

У 80—90-я гады XX стагоддзя ў пісьменніцкую супольнасць улілася маладая генерацыя таленавітых празаікаў. У іх ліку А. Глобус, А. Казлоў, А. Наварыч, А. Федарэнка і іншыя. Для іх метадалогія рэфлектыўна-дэтэрміністычнага характару не стала дамінантнай. Працэс мастацкай рэалізацыі ў тадышняй бурлівай рэчаіснасці вымагаў ад іх актыўнага самасцвярджэння: *"тут і цяпер"*. Творчая настраёвасць новага пакалення ў больш шырокім плане скіроўвалася на жывую фактуру сацыяльна-псіхалагічнай плыні навакольнага асяроддзя. Калі пісьменнікаў старэйшых пакаленняў змены гістарычна-палітычнага развіцця прыводзілі найчасцей у стан шокавага ўтрапення, скаванасці, то маладым творцам новыя перамены здаваліся заканамернымі і неабходнымі. Нечаканай і непрымальнай паўставала толькі *"тэмпературна-фонавая"* ступень зменлівасці тых падзей. Пераменлівыя рэаліі абвастралі грамадскія і сацыяльныя канфлікты эпохі. Адсюль і такая аголеная эмацыйна-эгацэнтрычная самаідэнтыфікаванасць герояў іх твораў. Прыгадаем толькі назвы першых кніжак некаторых празаікаў: "Гісторыя хваробы" А. Федарэнкі, "Міражы ценяў" А. Казлова, "Белы мурашнік" П. Васючэнкі. Творчасць празаікаў, якія прыйшлі ў літаратуру на пачатку 90-х гадоў XX стагоддзя, намі ўведзена праз каардынату канцэпта *"крыку"*. Найбольш выразным метадалагічным, эмацыйна-дынамічным індыкатарам для дадзенай плыні выступае не рэфлектыўнасць, а самавызначальная рэактыўнасць *"прагі крыку"*. Героі многіх твораў гэтых аўтараў выступаюць своеасаблівымі маніфестантамі матэрыяльна-душэўных праяў рэчаіснасці. Найбольш прымальнымі і паспяховымі для іх ідэнтыфікацыі і даследавання становяцца не якасна-лагізаваныя, а колькасна-рацыяналізаваныя параметры. У дзеяннях герояў назіраецца павышаная неабходнасць здзіўляць, эпаціраваць, расчульваць ці наадварот казытаць нервы людзей, якія іх акружаюць.

Формы матэрыялізацыі і сацыяльнай кадыфікацыі герояў набываюць таксама размаітую экстравагантную варыятыўнасць — *"матрац"*, *"галава"*, *"бомж"*. Усё гэта адводзіць фабульную завостранасць праблематыкі на лінію мяжы паміж хаосам і космасам. Апорнай праекцыяй выражэння ў такім плане з'яўляецца эмацыйна-пачуццёвая праяўленасць душэўных станаў, дзе хаос падзей імкнецца але не знаходзіць магчымасці спарадзіць быційную калізію духоўных адносін паміж людзьмі.

Так, герой твора А. Федарэнкі "Гісторыя хваробы" трапляе ў стан пакутліва-трагічных адчуванняў сваёй унутранай і знешняй адзіноты. Адсюль тое панічна-прагнае жаданне знайсці сувязь хоць з адной блізкай душой. Аднак, з іншага боку, мы не можам не заўважыць, што герою, абсалютна не спрактыкаванаму ў адносінах з людзьмі, замкнуўшаму "свой свет" на гіпербалізаваным хваравітым эгаізме, не стае практычнай адказнасці, якая і стварае прастору існавання. Таму ён і застаецца ў стане ўмоўнага балансавання, на мяжы крыку-болю.

Трэба адзначыць, што сучасная рэчаіснасць ускладняецца яшчэ адной анталагічнай дылемай, сэнс якой у маральнасці і амаральнасці перыпетый жыцця. Патлумачыць гэта можна тым, што асноўны механізм маральна-этычных пераходаў-пераключэнняў у наш час працуе не па традыцыйным культурна-каштоўнасным прынцыпе, а па прынцыпе "маральнасць-пазамаральнасць", каб такім чынам як бы падвысіць шкалу духоўных каштоўнасцей. Вось чаму ў герояў гэтай генерацыі пісьменнікаў пры абвостраным жаданні сказаць *сваё слова* нярэдка адбываюцца зрывы да выгаднага скарыстання пачуццяў і ўчынкаў.

У вялікай колькасці апублікаваных апавяданняў і аповесцей пісьменнікаў апошняга дзесяцігоддзя мы можам прасачыць, як быційныя і маральна-этычныя канфлікты зноў і зноў падпіхваюць іх герояў да духоўнай *варонкі* — тым самым даючы ім шанц для першаштуршка, за якім адкрываецца шлях да самога сябе, як да Чалавека.

Ігар ШАЛАДОНАЎ

Ніна ГАРАГЛЯД

МАТЧЫНА ПЕСНЯ

* * *

Ні палотнаў, ні хустак
Маці мне не дарыла.
Толькі песню мне ў сэрца
Трапяткую ўлажыла.
Кроў сялянская носіць
Яе ціха па жылах...
На ўвесь век мне спадчына —
Песня матчына.

* * *

У аўтобусе на мове роднай
Гамоняць цёткі і дзядзькі.
І чуецца мне спеў лагодны
І плеск палескае ракі.
Здаецца, побач з імі села б,
Душу ў гаворцы адвяла.
Ды толькі стрымвае нясмеласць
Адбітак сціплага сяла.
...Не здраджу мове свайго краю!
Тут нарадзілася я. Тут
З любоўю словы вымаўляю:
Радзіма. Піншчына. Мой кут.

* * *

Сляза роспачы набяжыць.
Загадаю сабе: трэба жыць.
І распрамяцца зноўку плечы.
Шчэ не вечар у акне,
не вечар.
Хай зласліўцы не мітусяцца
Задзімаць трапяткія свечкі.
Бог падорыць другое дыханне:
Шчэ далёка блукае мой вечар!

* * *

Больш хустка не мільгне твая
Ля грэблі ці ў гародзе.
Даўно, ты, мамачка мая,
Па раю ціха ходзіш.

Збяру я кветкі за сялом,
Якія ты любіла.
Рамонкамі і васільком
Абсыплю ўсю магілу.

На схіле жніўеньскага дня
Спакой, святлынь у соснах...
Цябе паклічу — цішыня.
Не адгукнешся. Позна.

* * *

Кляновы ліст на шыбе —
Ў дарунак залатоўка.
Прынёс свавольнік-вецер
Ад восені паштоўку.

І я пад шэпт дажджу
Той сумны ліст чытаю.
А вецер за акном
Мне на жалейцы грае.

* * *

Хустка шаліноўка
У чырвоных ружах.
Мілая абноўка
Не ад мужа.
І ад тайны ціхай
Палыхаюць шчокі.
Грэе твая памяць.
Мне не адзінока.

Хустка з кутасамі
Па чырвоным краі.
Ты мяне ў натоўпе,
Позні мой, пазнаеш...

* * *

Гарчыць адчай палынам.
Слязы не пакажу.
Я проста усміхнуся.
— Бывай! — табе скажу.

Кароткая сустрэча.
Працяг не варажы.
Блукае ўжо не лета,
А восень на мяжы.

Запозненасць пяшчоты
Да ўскрыку, да усхліпу...
Пацягнем кожны свой
Прывычны воз са скрыпам.

Мікола ТРАФІМЧУК

Палынны верш

Праз гэты луг прайду, не збочу
(П'яніць пах церпкі палыну!)
І буду сніць ліпнёвай ноччу
Палынна-даўнюю вясну.

За недасяжным перавалам,
Які за пылам і смугой,
Сяброў расстрачана нямала,
А з імі — роднага ўсяго...

Само жыццё наканавала
Мне сніць палынную
вясну.
Сяброў так мала,
шчасця мала,
Затое многа... палыну.

* * *

Жыву па прынцыпу:
далей будзь ад граху...
А ён так блізка,
невыносна блізка!
Да долу гне і цягне,
як валізка,
як пень,
як корч,
як строма
на шляху.

Я спатыкнуся,
часам упаду,
бывае,
што адразу за парогам...
Але ўстаю...
І гэта перамога!
Як трэба ўсё ж
бліжэй быць
да граху!

Душа

Нястомная душа!
Вунь цела спачывае...
Яна ж лунае ўсё
над пеклам і над раем,
ды сведчыць целу
і ў грахах і ў тлуме
пра ўсё,
што бачыць,
чуе,
плача,
думае...

Чароўная душа!
Не трэба ёй каноны,
зямныя і бязглуздыя
законы.
Крыштальная душа!
Ільдзінка ці расінка...

Няўлоўная душа!
Ні на хвілінку...

* * *

Струменіць час, пранізвае мяне,
Нясе душу-пушынку маю ў вечнасць.
А мы гаворым:
«Пройдзе ўсё, міне...»
Нічога не міне
пад Шляхам Млечным!

Ляціць душа-пушынка і ляціць...
І, нават, калі ў вечнасць прылятае,
Яна ўсё тая ж, як і пры жыцці:
І грэшная і крышачку святая.

Усё ўвабрала, кожны міг зямны,
Гатовая да вечнасці, гіены...
Прайгралі д'яблы!
Тленныя яны!..
А вось Яе Гасподзь стварыў
нятленнай!

Павел ГАСПАДЫНІЧ



* * *

Чалавек убачыў сябе ў люстэрку
І... не пазнаў,
Бо час,
Апераджаючы самога сябе,
Пакідае толькі памяць,
Якую, быццам таго вампіра,
У люстэрку не згледзець...

РУКІ...

Вашы рукі...
Вашы цёплыя, бы летні дождж,
рукі...
Мяккія,
Пяшчотныя,
Як быццам два агеньчыкі
ў віхуры цемры,
Кіруюць да выратавальнага берага.

Вашы рукі...
У кожным руху — самоты гукі
І надзвычай салодкія мроі...
Дакрануцца да іх —
І разам з Фаэтонам застацца
У святле вечнага свята...

Вашы рукі...
Дзве пяшчотныя кветачкі ў полі.
Дакрануцца да іх —
І на волю
У палоне,
У надзейнае іх абароне.
Вашы рукі —
Вашы цёплыя мяккія рукі...

СЛОВА

Слова...
Так падобна на
Зіхоткі вугалёк...
Зрываецца ў цемру
З найчароўных галінак
Дрэва Кахання —
Вуснаў тваіх...
Падзьмуў ветрык
І маленечкі вугалёк —
Слова —
Праз вочы твае —
Вогнішча Даверу —
Імкне да іншай небяспекі —
Адлюстравання начных нябёсаў —
Вачэй маіх.
А праз гэта —
У сэрца,
У душу,
У памяць маю...
Зачараваны маленечкі вугалёк
Паміж светлым цяплом вогнішча
і цемрай начных нябёсаў —
БЕЛАРУСЬ.



Мал. Ул.ЛУКШЫ

Метэарытнае жалеза

Апавяданне

Раіса БАРАВІКОВА

Да сённяшняй раніцы, а гэта была ўжо восьмая гадзіна адной са жнівеньскіх пятніц, Вольга Пятроўна лічыла сябе даволі-такі адданай жанчынай аднаму-адзінаму мужчыну — свайму мужу. І цяпер запіхваючы прадукты — шматлікія скруткі, пакеты, слоікі ў дарожную сумку, не без зларадства, шкада толькі, што муж не можа пранікнуць у яе думкі, разважала: «А чаму я думаю, што ўсё здарыцца, менавіта, сёння, калі яно ўжо адбылося значна раней. Ну, вядома ж, яшчэ тады, у лістападзе, у мінулым годзе ў паліклініцы...»

Месца, шчыра кажучы, зусім непрыдатнае для далікатных знаёмстваў, але ёй выпала сустрэцца з Паўлам Мікалаевічам, менавіта там, у калідоры ля кабінетных дзвярэй, куды яна прыйшла на прыём да неўрапатолага. Стаяла ля сцяны, моршчылася ад болю, потым, накульгваючы, прахаджвалася па калідоры, і ён, назіраючы за ёй, некалькі разоў парываўся ўстаць.

— Ды сядзьце вы, нарэшце! Чым тут чакаць прыёму, ці не прасцей было звярнуцца па хуткай дапамозе?!

— А якая вам справа, што мне прасцей, што не прасцей?!

— Лагічна, не мая справа, — і праз нейкі момант запытаўся. — Радыкуліт?

У бальніцах ды паліклініках ёсць толькі адна катэгорыя людзей: хворыя людзі з адной толькі розніцай, як цяжкахворы, таму ніколькі не збянтэжыўшыся, гэта ж тычылася яе хваробы, яна адказала:

— Грыжа пазванковая. Прыватнік не дапамог.

Дзяўчына, што сядзела побач з Паўлам Мікалаевічам, паднялася, адышла далей ад іх, да акна, і Вольга Пятроўна села на яе месца. Ён павярнуўся да яе, неўзнарок даткнуўся плячом да яе пляча і ў яе вачах на імгненне застыла замяшанне. Калі б ёй цяпер было не сорак дзевяць гадоў, а семнаццаць, яна, не выключана, заружавелася б.

— Гледзячы, які прыватнік, — тым часам казаў ён. — Магу даць тэлефон аднаго свайго знаёмага доктара, зробіць пяць-шэсць ін'екцый... Мне дапамагло, думаю, і вам паспрыяе. Калі хочаце, вось мая візітоўка. Вечарам патэлефануйце, знайду ў запісных кніжках патрэбны вам нумар.

І яна патэлефанавала вечарам. І, хаця да паслуг таго доктара так і не звярнулася, гэтае выпадковае знаёмства з Паўлам Мікалаевічам перарасло ў адносіны працяглага флірту, напэўна, сказала б какетка. Але Вольга Пятроўна не была какеткай. Ёй хацелася глыбокага пачуцця, салодкага п'янлівага дурману, палкасці, трапятання, якое да часу ў ёй толькі тлела. Але тлела нязгасна і неадступна. І, калі, здаралася, пасля стыпендыі, назаўтра ж дачка прасіла ў яе грошай на абед і тлумачыла, што ўсё да рубельчыка аддала за італьянскі станік, які ўчора набыла ў «Бюсцье», яна тут жа пачынала распытваць у дачкі, дзе знаходзіцца той шапік.

Так, апошнім часам Вольга Пятроўна акрамя італьянскай бялізны ніякай іншай ужо для сябе і не ўяўляла. У думках яна ўсё часцей і часцей набліжала той момант, калі Павел Мікалаевіч, нарэшце адважыцца і, чаго ўжо, напэўна, даўно не робіць з жонкай, пачне расшпільваць на ёй нейкія кнопкі, гузікі, гаплікі...

Сумка ўжо была поўная, а Вольга Пятроўна ўсё яшчэ стаяла ля халадзільніка і нешта запіхвала і запіхвала ў яе. Адарвалася ад гэтага занятку толькі тады, калі на кухню зазірнула дачка.

— Ого-о! — яна паспрабавала падняць сумку. — І ты гэта ўсё пацягнеш да электрычкі? Я нават на вакзал не змагу цябе падкінуць. Учора паставіла машыну ў Вадзікаў гараж, а ён з'явіцца ў горадзе толькі дзесьці ля абеду. Тэрмінова кудысьці з'ехаў!

— Не тлумач гэтак доўга. Я ж не прашу, каб падвезла мяне да вакзала. І ўвогуле, Кацечка, зрабі ласку, ідзі да сябе, а то я яшчэ што-небудзь забуду.

Вольга Пятроўна сапраўды баялася штонебудзь забыць. Той столік на дваіх, які яна меркавала накрыць сённяшнім вечарам, павінен быць бездакорным ва ўсіх адносінах. Але ж не раскажаш пра такое дачцы, хай сабе і дарослай, як і пра тое, што ўчора яна патэлефанавала Паўлу Мікалаевічу і запрасіла яго да сябе на сядзібу, у райскі куток, як калісьці жартаўліва называлі яны з мужам тыя трыццаць сотак зямлі са звычайным сялянскім дамком, што набылі тры гады таму ў невялікай вёсцы, — з дзесятак хат, не болей.

— Гм-м, вельмі нават заманліва, — і Павел Мікалаевіч штосьці ў думках прыкідваў, гэта яна адчула па голасе, ужо навучыўшыся разбірацца ў яго адценнях. — Дык, кажаш кіламетраў шэсцьдзесят ад Мінска? Буду старацца... Праўда, загваздка адна ёсць, паліва дзесьці прасочваецца, трэба будзе на СТА заехаць. Калі зачапіў дзесьці бак, давядзецца заварваць. Сама разумееш, пакуль яго здымуць, прасушаць... Добра, — нарэшце прамовіў ён, — кажы канкрэтна, куды я павінен ехаць?

І яны дамовіліся, што вечарам а дзевятай гадзіне яна будзе чакаць яго на паваротцы, адкуль ужо разам пад'едуць да сядзібы, каб ён не шукаў хату, ні ў кога не распытваў...

«Усё! Здаецца спакавала!» — Вольга Пятроўна рашуча падняла сумку і, калі ўжо была гатова пакінуць кватэру, са свайго пакоя выйшаў ейны муж, запытаўся:

— Ужо едзеш?

Вольга Пятроўна моўчкі кіўнула галавой.

— Зайздрошчу табе. Я таксама паехаў бы, але ў нас сёння... Учора ідзу, а ў холе зноў чорная рамка... Яна паставіла сумку на падлогу, пацікавілася:

— І, хто ж на гэты раз у вас памёр?

— Кулеш! Ты ж ведала яго. Хоць даўно і разбегліся мы ў розныя бакі, а на пахаванне ісці трэба. Калісьці дванаццаць гадоў у адным бюро разам адседзелі. І во-о, як яно. Канец заўсёды непрадказальны. Быў чалавек і няма чалавека. Помню тады, на пачатку дзевяностых ён, бы з ланцуга сарваўся. Бізнес! Бізнес!

— Ты ж казаў, у яго ўсё добра складваецца.

— Складвалася! На пачатку. А пасля аказалася, што не ў той вагон сеў. Трэба было ў плацкартным ехаць і ехаць, а яму ў мяккі схацелася. Пакуль едзеш у сваім — усё ў норме, а як толькі перасаджваешся, тут і пачынаецца... Але хопіць пра Куляша. Зямля яму пухам. Ты вось што... Будзеш у нядзелю вяртацца, пазачыняй добра ўсё і грыжу сваю не надрывай. Гарод — гародам, соткі — соткамі, але помні, яны — не твой вагон...

Ён любіў павучаць і яна дазваляла яму рабіць гэта, хоць у рэшце рэшт усё рабіла пасвойму. І ўжо недзе праз гадзіну, калі за вокнамі электрычкі мільгалі лясы, вёсачкі, бульбяныя і жытнёвыя палеткі, яна ў думках вярнулася да гэтай іхняй размовы. А ў якім вагоне цяпер яны? Але мела на ўвазе не плацкартны і не мяккі вагон, у іхнім жыцці быў і той, і другі, а зусім іншае. У якім бы вагоне ім не здаралася ехаць, яны заўжды былі разам. Іхнія месцы знаходзіліся побач — локаць да локця... Ды ў жыцці нічога вечнага няма. Гэтая ісціна толькі пацвердзілася тым адвячоркам два гады таму, калі яны селі за святочны стол, каб адзначыць першую публікацыю дачкі ў студэнцкай газеце «Малады навуковец». Дачка хутка пакінула іх, паехала паказаць публікацыю сяброўцы, а яны ўключылі тэлевізар... Потым ён падсеў да яе, абняў за плечы, што як высветлілася праз хвіліну, было цалкам езуіцкім жэстам, і сказаў:

— Ведаеш, Волечка, а ў нас з табою праблемы!

— У цябе штосьці здарылася на працы? — занепакоілася яна.

— Ды не, — ён пачаў круціць у руках відэлец, быццам яму раптоўна схацелася праткнуць нешта. — Усё значна складаней. Разумееш... Даруй і не задавай ніякіх пытанняў. Дзяўчына, Леначка, практыкантка наша зацяжарыла, — і ён забарабаніў відэльцам па стале.

Яна насцярожылася і, быццам пачула не свой, а чужы голас:

— Хм-м, Амерыку мне адкрыў! Яны цяпер раннія і цяжараць, бы кошкі!

— Волечка, ты не так зразумела. Леначка зацяжарыла ад мяне. Трэці месяц і я не магу яе кінуць. Магчыма, яна народзіць. Вы ўжо тут з Кацярынай без мяне... Я буду рэгулярна прыносіць грошы.

Муж прамаўляў усё гэта без запінкі, як акцёр, які выйшаў на сцэну свайго сотага спектакля, а ў яе нейкі даўкі камяк перахопліваў дыханне. І ўсё ж яна змагла вымавіць:

— Ты з-за гэтага відэльцам застукаў? Шумавое афармленне! І, колькі ж практыканцы Леначцы гадоў?

— Дваццаць два. Яна толькі на год старэй за нашу Кацю.

— Ну і, калі ж ты нас з Кацяй пакінеш?

— Сёння, — і тут яго падвёў голас. Ён закашляўся, адсунуўся ад яе, апусціў галаву. — Даруй, Вольга. Ты пакуль не будзеш прыязджаць на сядзібу, га-а? Мы з Леначкай з... З месяц пажывём там, пакуль практыка не скончыцца. Яна потым паедзе да бацькоў у Віцебск. А я... Я тут нешта падшукаю. Думаю, зняць кватэру праблемы не будзе.

У яе самым натуральным чынам затрэсліся рукі і, каб не паказаць гэтага, яна сціснула пальцы ў кулак і нейкая сіла падняла яе з крэсла. Яна так і стаяла перад ім са сціснутымі кулакамі, што ён зразумеў пасвойму.

— Ты што, Вольга?! Прыйдзі ў сябе, мы ж інтэлігентныя людзі.

— Пайшоў ты! — яна ўжо не ў сілах была стрымліваць слёзы і выбегла ў спальню.

Праз паўтара месяцы муж вярнуўся. Леначкіны бацькі ўмяшаліся ў іх адносіны і з апошняга універсітэцкага курса перавялі дачку на вучобу ў Віцебск. А Вольга Пятроўна за гэты час з трапяткой, сонечна-ўсмешлівай лагоднай жанчыны ператварылася ў строгую матрону, якая свідравала гнеўным позіркам кожную маладзенечкую дзяўчынку, быццам яна была не маці дарослай дачкі, а старою дзеўкаю. Да вяртання мужа яна аднеслася абыякава. Ён хваляваўся і, відаць, загадзя падрыхтаваў цэлую тыраду:

— Волечка, ты можаш не дараваць мне, але зразумець павінна! Будзем лічыць гэта... Ну... Усё, што адбылося... Часовым разладам. Ты ж паглядзі... Народы канфліктуюць, нацыя з нацыяй ужыцца не можа, а мы.. Мы, стомленыя, узвінчаныя, прыгнечаныя гэтым зямным хаосам! Мы толькі дзве пясчынкі ў сусветным маштабе. Даруй за выраз, я, напэўна, павінен гаварыць прасцей. Ну, давай, давай.... Спагані на мне крыўду, вазьмі і плясні па маёй мызе. Я вінаваты, я сцярплю... Я нават вельмі хачу гэтага!

Яна неяк нязвыкла дзіўна, па-новаму для яго пасміхнулася і сказала:

— Васечка, ты ж не выпісваўся з кватэры. Жыві. Але ніякай сумеснай спальні. Я сабе канапу купіла, сплю ў гасцёўні.

Для чужога вока нічога ў іхнім жыцці не змянілася. Яны разам садзіліся за сямейны абедзенны стол. Здаралася, што нешта разам куплялі і ўсё ж жылі, хутчэй за ўсё, як суседзі. Нават на сядзібу выязджалі часцей за ўсё паасобку. Ён — у адны выхадныя дні, яна — у другія. Цяпер была яе чарга і, сышоўшы з электрычкі, Вольга Пятроўна непакоілася, хоць бы вялікага беспарадку ў хаце не было. Муж знаходзіўся на сядзібе мінулымі выхаднымі днямі і звычайна пасля сябе пакідаў сапраўдны вэрхал. Сумка была непамерна-цяжкая і цягнуць яе да сядзібы трэба кіламетры два. Прасцей узяць прыватніка-таксіста, што яна і зрабіла. І, як толькі паднялася на ганак хаты, імгненна забылася пра ўсе жыццёвыя мітрэнгі: пра мужа, пра сваю гарадскую кватэру — у райскім кутку пра зямное не думаюць. Вось толькі Павел Мікалаевіч...» Ці спадабаецца яму тут? — думала яна. — Сад павінен спадабацца, газоны з клумбамі і клумбачкамі, якія, дзякуючы Васевым стараням, заўжды акуратна выкашаныя».

Вольга Пятроўна выкладвала з сумкі пакеты і слоікі, ставіла іх у халадзільнік і міжволі радавалася: «Паша любіць паштэт з цялячай пячоначкі і вось ён, акурат, тут! І салата з чарнаслівам зроблена, і бараніна на костачцы! Божа, а дзе масліны? Забылася! Не-е, вось яны. А тут, што ў нас? Ага-а, палтус, запечаны ў цесце. А гэта — морсік!»... Яна захапляцца сваімі кулінарнымі здольнасцямі, уяўляла Паўла Мікалаевіча, раз-пораз пазірала на насценны гадзіннік. Ёй здавалася, што стрэлкі гадзінніка надта ж марудна рухаюцца. Потым, калі прадукты былі выкладзены ў халадзільнік, Вольга Пятроўна абышла ўсе чатыры пакоі, збіраючы абы-як, раскіданыя мужам рэчы: старыя штаны на канапе, з калашынаў церушылася ўжо сухая, пасечаная газонная трава; кашулі, запэцканыя глінаю, цэментам, світэр, плашч-дажджавік, павешаны на спінку крэсла, шорты, майкі... І, калі назбіралася ўжо цэлае бярэма, вырашыла: трэба ўсё гэта пакуль скінуць у стары куфар, які стаяў у клеці. Ён ім дастаўся ў спадчыну ад былых гаспадароў, якія з'ехалі ў адрозненні ад іх, назаўсёды ў горад.

Пайшла ў клець, падняла века, шпурнула туды ўсю старызну і заўважыла ў кутку куфра распатрошаны скрутак, які ці забыліся, амо проста пакінулі ранейшыя гаспадары. Трэба было яго даўно выкінуць ды муж не дазволіў ёй гэтага зрабіць, маўляў, навошта выкідваць, хай сабе і чужое, але жыццё. У тым скрутку сапраўды было спакавана цэлае жыццё і, можа, нават не аднаго пакалення: лісты, паштоўкі, фотаздымкі, тэлеграмы, розныя квіткі, даведкі... І вось гэта ўсё цяпер расшкамутана, раскідана па кутках куфра. «Напэўна, мышы дзесьці прагрызлі ў дошках куфра дзірку, — мільганула ў яе думка. — Яны ўжо чуюць блізкую восень, уцякаюць з палеткаў да чалавечага жытла. А, можа, нават пацукі?» — і Вольга Пятроўна, адкінуўшы века да сцяны, пачала збіраць раскіданыя паперчыны. Позірк затрымаўся на пажоўклым і дзе-нідзе ўжо сатлелым аркушы. А вось яшчэ адзін, такі ж самы. Узяла ў рукі паперу, падышла да невялікага акенца... Почырк быў дробны-дробны, як бісер, ды яшчэ і з загагулінамі на асобных літарах, але чарніла не выцвіла.

Лічбы прачытала адразу, яны былі буйныя, па цэнтры аркуша: 1841 ад Нараджэння Хрыстова. І ніжэй больш дробна: протаіерэй Нікадзім, раб Божы. І яшчэ ніжэй: Свята-Пакроўская царква міласцю Божай... Далей радкі былі, дзе сцёртыя, дзе размытыя, захаваліся толькі асобныя літары. Вочы ўжо прывыклі да іх і на адваротным баку аркуша яна тое-сёе змагла прачытаць, дадумваючы неразборлівыя словы.

3.3. З мястэчка вярнуўся дыякан Восіп. Прывёз два пасярэбраныя кадзілы і сорак свечак. Па маіх падліках свечак павінна было быць шэсцьдзесят дзве. Але, як магу падумаць благое пра дыякана, калі Святым Днём яго ахвяраванне было найвялікшае.

15.3. З Дубянцоў прывезлі хрысціць дзіця. Дзяўчынку. Запісаў, як і належна ў гэты дзень, імем святой Еўфаліі. І хросная зрабіла вялікія вочы, запыталася: «Як жа нам цяпер зваць яе, бацюшка? Хіба што Фаняю?

19.3. Прыходзіла на споведзь маладая пані з маёнтка. Яе вочы — знаходка для багамаза. Але малады пан не бачыць яе вачэй. Ён бачыць толькі яе правую нагу. Кульгавую. Гэтаксама, як бачыў тыя сем валокаў зямлі, што далі за ёю. А яшчэ пан бачыць дзябёлую Зоньку, што пры хлявах у іх. У Зонькі лёгкая рука. Яна прымае ацёлы ў першацёлак. Пані плакала, у пана смярдзіць сурдут хлявом і, напэўна, хай не чуюць мяне анёлы, Зонькаю. Даруй, сто разоў даруй Ойча Усявышні, што давяраю чужую споведзь паперы.

23.3. Тутэйшыя людзі кажуць, што кара нябесная абрынулася, а на справе — прыродная з'ява. Учора пасля ранішняй службы, калі прыхаджане пакідалі храм Божы, з неба ўпаў метэарыт. Памерамі невялікі, але шкоды нарабіў шмат. Згарэлі хлявы панскія, ён рыхтык туды пацэліў, і шмат прыбудоў да хорама панскага. А сам хорам ацалеў, толькі адна калона трэснула. Выбух вялікі быў, шмат саламяных стрэх наўкол пазлятала. А ў садзе панскім дрэвы з зямлі павывальваліся. Але самае страшнае, што ў хлявах згарэў малады пан, а яшчэ конюх панскі, і Зонька — згарэла — даглядчыца за жывёлай панскай. І шмат скаціны пагарэла. Цяпер на месцы аднаго з хлявоў — яма. Паглядзець на яе людзі вучоныя ажно з самога Менску едуць.

26.3. На споведзь прыходзіла маладая пані. Пачутае моцна ўразіла мяне. Толькі, ці ў сабе яна? Жалоба вялікая. Вядзі руку маю, Ойча, а калі не пажадана Табе тое, спыні яе. Маладая пані тым страшным днём стаяла ля акна, бачыла, як малады пан з Зонькаю заходзілі ў хлеў. Зонька развязвала пасак на спадніцы, а пан расшпільваў сурдут. Тут і скажы маладая пані: «Каб на вас камень з неба ўпаў!» І ў адначассе ўсё гэтак і здарылася. Прасіла яна зняць грэх з душы яе, а я, мяркую, з розумам у маладой пані не ўсё добра. Вялікае гора засціць яго.

30.3. Адпяваў нябожчыка ў Рагачах. Прыехалі па мяне на падводзе, а лепш бы на чоўне прыплылі. Павадак вялікі. Ад ямы на панскім падворку жарам дасюль патыхае.

Вольга Пятроўна пачула, як бразнула клямка, зарыпелі ўваходныя дзверы. Яна хуценька сунула гэты пажоўклы аркуш, што трапятаў у яе руках, у куфар, быццам яе заспелі за чымсьці нядобрым. Апусціла века і выйшла ў сенцы, дзе пабачыла суседку Веру, якая ўжо адчыняла дзверы ў пярэдні пакой.

— Пятроўна, вы нешта сёння рана? Васіль Антонавіч і казаў, што сёння можаце прыехаць. А ў нас тут у сераду навальніца была. Глянула я цераз плот, а ў вас памідоры пагнула. Я тры карчы наноў падвязала. А, мо, не трэба было? Па чужым гародзе хадзіла.

— Чаму ж не трэба? Дзякуй, Вера. Я вам

(Працяг на стар. 15)

Арт-пацеркі

Да 27 лістапада ў мастацкай галерэі Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці атабарыўся... "Балаганчык"! Так называецца ўжо традыцыйная выстаўка лялек, у якой удзельнічаюць работы прадстаўнікоў Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, Беларускага саюза дызайнераў, "вольных" лялечнікаў, юных творцаў. Экспануюцца лялькі касцюмныя, інтэр'ерныя, гульнёвыя.

Першым, хто напісаў пра ўжо легендарны крыж, які вырастае з-пад зямлі на Барысаглебскіх могілках у Тураве, лічаць Юрыя Кур'яновіча. Наогул, у поле зроку гэтага чалавека трапіла нямала адметнасцяў маляўнічай і загадкавай Тураўшчыны, што ўвасобіліся на яго жывапісных палотнах і ў фотаработах. Працу ў МУС Беларусі ён плённа спалучае з творчай дзейнасцю: правёў ужо 11 персанальных выставак, аб'яднаных агульнай тэмай: "Варыяцыі на спрадвечнае". Цяпер фотавыстаўка Ю. Кур'яновіча "Краявіды беларускай Палесціны" наладжана ў Тураўскім краязнаўчым музеі. За яе нечаканай і экзатычнай назвай — вобраз Беларускага Палесся, адлюстраваны ў здымках, зробленых падчас вандровак на Тураўшчыну ў 1998-2005 гадах.

У лістападзе працягваецца традыцыйны Міжнародны фестываль арганнай музыкі "Званы Сафіі". Выступленні арганістаў адбываюцца ў Канцэртнай зале Полацкага Сафійскага сабора па выхадных днях. Заўсёдная ўдзельніца фестывалю — салістка гэтай залы, лаўрэат Міжнароднага конкурсу Ксенія Пагарэлая.

Наведнікі Дома Ваньковічаў (філіяла Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі) мелі магчымасць азнаёміцца з выстаўкай факсімільных копій работ М.К. Чурлёніса. Экспазіцыя "Стварэнне свету святла і гармоніі. Мікалоюс Канстанцінас Чурлёніс" прымяркоўвалася да 130-годдзя з дня нараджэння гэтага знакамітага самабытнага літоўскага творцы — кампазітара і мастака.

Ва ўкраінскім горадзе Каневе, у межах ужо традыцыйнага, VII Міжнароднага музычнага фестывалю "Фарбатоны", упершыню адбыўся конкурс маладых выканаўцаў на драўляных інструментах, зладкаваны па ініцыятыве Кіеўскай дзіцячай акадэміі мастацтваў. Выдатна паказалі сябе музыканты з Беларусі — студэнты БДАМ: Гран-пры атрымаў кларнетыст Яўген Аўсяннікаў (клас прафесара У.Скараходава), 1-й прэміяй ганараваная флейтыстка Таццяна Кармазінава (клас прафесара Б.Нічкова).

С.ВЕТКА

Фота К.Дробава

Адчуванне таго, што я трапіў ў стагоддзе XV або XVI, не пакідала мяне два дні. Хаця знаходзіўся я ў даволі сучасным месцы — Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі. Верылася ў гэта з цяжкасцю, бо стаяць у чарзе па каву-аўтамат можна было з сапраўдным рыцарам, а каля люстэрка сустрэць паненак у карсэтах і пышнай вопратцы. Бо тут праходзіў III Міжнародны фестываль сярэднявечнай музыкі "Legenda Autuna", ці "Легенда восені".

«LEGENDA AUTUNA»: пабачыць Сярэднявечча

Чаму "фестываль музыкі"? Гэтага я не зразумеў. Танцаў, і іншых відаў творчасці, было не менш... Зрэшты, калі быць канкрэтным і пералічваць усіх удзельнікаў, то гэта: музычныя калектывы "Brevis", "Testament", "Ліцьвінскі хмель", "Вайдэлот", "Рокаш", танцавальныя калектывы "Bassdance", "Золотой двор", "Gloria d'Amore", "Campanella", "Гистрион", "Alla Brevis", "Подражание народному", "Легенда", "Элегия", "Рарог", "Зорачка", "Реверанс" і трукавыя гурты "Берсерк", "Bassadance", "Стихии мира".

— У нашым палацы ўжо 10 год працуе рыцарскі клуб. І аднойчы ў гэты клуб прыйшла маладая студэнтка Алена Гаршкова і пачала развіваць старадаўні танец. Потым яна скончыла вучобу, прыйшла да нас на працу і стварыла ансамбль "Bassdance". І тры гады таму яго ўдзельнікі сталі ініцыятарамі такога восеньскага фестывалю. Тут знаходзяць сабе месца гурты сярэднявечнай музыкі і танца, прычым не толькі з нашай краіны. Сёлета, напрыклад, прыехаў ансамбль "Drolls" з Петразаводска, — расказала Ірына Навіцкая, загадчык аддзела масавай культуры.

— Чаму менавіта восень?

— Відаць, іх восень натхняе, як Пушкіна... Дарэчы, сёлетні фэст адрозніваецца ад папярэдніх тым, што, акрамя музыкі і танца, шмат увагі аддадзена гістарычнаму касцюму.

Сапраўды, у галерыі "Палац" можна было паглядзець выставу "Эпоха і мода", а яшчэ — паўдзельнічаць у семінары на тэму "Шляхі эвалюцыі гістарычнага касцюма. Усё пра карсэт". Цікава, што ўдзельнікі імпрэз шыюць сваю вопратку самі. Калі я ўбачыў скураны абутак (ведаеце, такі вастраносы і амаль без падэшвы), то адчуў павагу да таго, хто здолеў гэта зрабіць.

Сэрцам фестывалю, напэўна, быў галаканцэрт, які праходзіў ў Мармуровай зале. Менавіта тут паказвалі сваё майстэрства музыкі і танцоры. (Скажу, не хаваючы, што адчуў сябе абсалютным ёлупнем і невукам, бо дагэтуль не ведаў, як выглядаюць гуслі. Цяпер ведаю...).

Адкрыў музычную праграму гурт "Вайдэлот", удзельнікі якога па-майстэрску пасярэдзіне кампазіцыі змянялі свае адмысловыя інструменты на іншыя, мне таксама невядомыя. Прыгожая музыка, старадаўняя вопратка, незразумелая назва — усё гэта незвычайна і надзвычай цікава. Дарэчы, наконт назвы:

— Вайдэлоты — гэта людзі, якія ў сярэднявеччы захоўвалі традыцыі і культуру XI-XIII стагоддзяў, займаліся шыццём, музыкай, паэзіяй. Недзе ў XV ст. яны пачалі хадзіць па вёсках як музыкі, — "прасвятліла" Кацярына Радзівілава. Грала яна на гуслях, зробленых музыкам гурта "Стары Ольса" Алесем Чумаковым.

— А чаму менавіта сярэднявечная музыка?

— Усе мы ў асноўным — выхадцы з рыцарскіх клубаў, а рыцарскія клубы і іх музыка, культура — гэта ўсё адна і тая ж "каша", — патлумачыў Зміцер Ігнаценка. На сцэне ён стукаў у барабан.

— Адкуль вы бераце матэрыял для вашых кампазіцый: пішаце самі ці знаходзіце гістарычныя крыніцы?

— Мы робім свае аранжыроўкі паводле канонаў, якія існавалі ў той час, і хочам папулярызаваць менавіта беларускія мелодыі, — адказала Кацярына Радзівілава і адкрыла мне тыя тэхналогіі, паводле якіх пішацца і жыве такая музыка. Пасля мне вельмі захацелася памацаць які-небудзь інструмент, і я адабраў у Зміцера Саўчана яго дуду: скураны мяшок, надзімальная трубка і ражок, праз які непасрэдна выходзіць гук. Пакуль я надзімаў мяшок, мне расказалі, што інструмент гэты зроблены беларускім майстрам Алесем Ласём. Каб пачуць гук, трэба націснуць на мяшок локцем і затуліць дзірачкі на ражку...

Гледачоў у той вечар не абмяжоўвалі простым сядзеннем у зале. Калі, напрыклад, на сцэне граў даволі знакаміты гурт "Ліцьвінскі хмель", усім было прапанавана паўдзельнічаць у майстар-класе і навучыцца танцаваць па-сярэднявечнаму. Адзначу, што ахвочых было даволі шмат.

Заканчваўся фэст сапраўдным вогненным шоу. Вось гэта было — іначай не скажаш — грандыёзнае відовішча! Уявіце сабе: пляцоўка ля палаца, дзевятая гадзіна вечара, туман. Пад адкрытым небам гучыць музыка з прыгожай барабаннай партыяй, а перад натоўпам гледачоў танчаць з паходнямі ды "плююцца" полымем сапраўдныя факіры. У цемры ўсе агні зліваліся і ўтваралі дзівосныя малюнкі. Пакуль я спрабаваў сфатаграфаваць гэта, у галаве круцілася толькі адно слова: "шаманства". Здавалася, зараз убачу прывіды і розныя цуды. А калі гаварыць сур'ёзна — гэта было насамрэч цікавей за "афіцыйныя" салюты і надакучлівыя святочныя феерверкі.

І фінальнае вечаровае шоу сталася апошняй кропляй упэўненасці, што праз год прыйду сюды зноў... Калі, канечне, усе рыцары не сыдуць на Лівонскую вайну, а "шаманаў" не спаляць інквізітары.

Алесь КІРЫКОВІЧ

Фота аўтара

ЗНАКІ ПРЫЯЗНАСЦІ

Пачатак сёлетняга, ужо чацвёртага фестывалю "Восень з польскай культурай" спалучыўся з правядзеннем у нашай сталіцы вядомай міжнароднай акцыі мастакоў "Навінкі-2005". Да арганізацыі гэтага традыцыйнага свята перформансу спрычыніўся Польскі інстытут у Мінску. Шаноўная асветніцкая ўстанова за 10 гадоў (дакладней, мінае год адзінаццаты) сваёй дзейнасці на Беларусі зрабіла нямала дадатнага дзеля развіцця і ўзбагачэння культурных ды паглыблення сяброўскіх стасункаў дзвюх нашых краін-суседак. І "Восень з польскай культурай" — адна з такіх салідных ды перспектыўных спраў. Гэтымі днямі фестываль у разгары, і пакуль яшчэ рана рабіць абагульненні ўражанняў ад сёлетніх імпрэз, ажыццёўленых — што асабліва радуе — не аднабаковымі намаганнямі, а ў памяркоўным творчым, навуковым ды асветніцкім польска-беларускім узаемадзеянні. Але і сёння відавочна, што ўражанні — станоўчыя, узаемадзеянне — плённае, вынік — сур'ёзны і ўсцешны. Які прыклад можна тут згадаць? Спектаклі, прадстаўленыя на Міжнародным тэатральным фестывалі "Белая вежа-2005" у Брэсце, гаворку пра якія вяла на старонках "ЛіМа" мастацтвазнаўца і крытык Таццяна Катовіч (гл. газету за 4 лістапада). Два шчырыя вечары-канцэрты, прысвечаныя творчасці польскіх кампазітараў XX стагоддзя Караля Шыманоўскага ды Ігнацыя Падэрэўскага і зладкаваныя перспектыўнымі маладымі нашымі выканаўцамі — студэнтамі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Вытанчаная, у лепшым сэнсе слова эстэцкая праграма нашага ж Ансамбля салістаў "Класік-Авангард" пад кіраўніцтвам Уладзіміра Байдава, прадстаўленая мінчукам неўзабаве пасля яе прэм'еры на Міжнародным фестывалі "Варшаўская восень". Нягучны, далікатны лейтматыў вяртання да простых і адвечных чалавечых каштоўнасцяў у спалучэнні з феерверкам дасціпнасці ды непаўторнага польскага гумару ў новых камедыйных фільмах, паказаных на "фестывалі ў фестывалі", які прыняў кінатэатр "Цэнтральны"...

Трапна заўважыў дырэктар "ІР" Цэзарый Карпіньскі: "Радуюць кантакты між творчымі асобамі і культурнымі асяродкамі нашых краін. Самі па сабе гэтыя кантакты важныя, ды найбольш важна тое, што потым нараджаецца дзякуючы ім. Бо ўсялякая ізаляцыя ў чалавечых стасунках ні да чаго добрага не вядзе. А ў дачыненні да культуры — ізаляцыя... забівае". Суладна распрацаванаму (дарэчы, вядомаму і нашым чытачам) плану шматгаліновыя праекты фестывалю "Восень з польскай культурай-2005" паспяхова спраўджваюцца, жывяць і нашу мастацкую атмасферу, і — прыязныя стасункі з блізкай нам краінай.

С.БЕРАСЦЕНЬ

ДОМ ДЛЯ НАШАГА класічнага пейзажа?

Вераснёвымі днямі ў сталічным Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва праходзіла выстава "Фестываль пейзажа", прысвечаная народнаму мастаку Беларусі Віталю Цвірку. Самыя строгія калегі называюць яго лепшым пейзажыстам, лічаць зоркай першай велічыні ў нацыянальным пейзажным жывапісе і наогул — адным з першых майстроў у нашым выяўленчым мастацтве.

Ён стварыў манументальна-велічны, эпічны, дынамічны, экспрэсіўны лірычны вобраз беларускай прыроды. Суб'ектыўнага ў пейзажах В. Цвіркі амаль няма, мастак быў надзелены здольнасцю так адчуваць прыроду, што праз яго пэндзлі яна быццам сама пачынала з намі размаўляць. З вялікім майстэрствам, таленавіта, аднолькава пераканаўча Віталь Цвірка паказваў на сваіх палотнах пранізліва-ветраную прастору, спякоту лета, ціхую развітальную мудрасць восені, магутную радасць абуджэння зямлі вясною. Колер на ягоных палотнах уражвае багаццем — у кожным пейзажным вобразе...

І ўсе мастакі, хто добра ведае творы гэтага майстра, з засмучэннем адзначаюць, што пабачыць такі цуд немажліва, бо няма ў нас па сённяшні дзень будынка, залы, дзе былі б выстаўлены творы знакамітага мастака Беларусі XX стагоддзя, якога, можа, нават больш за нас ведаюць у замежжы і вельмі цэняць.

У кожнай краіне ёсць музеі мастакоў, якія заслугоўваюць, каб на дзяржаўным узроўні адзначылі іх менавіта гэткім чынам. Хацелася б належнай афіцыйнай даніны павагі і да нашага Майстра пейзажа — у нас.

Дачка Цвіркі Таццяна Вітальеўна была запрошана Міжнароднай гільдыяй жывапісцаў на сустрэчу, прымеркаваную да вернісажа. Яна аддзячыла Фёдару Ястрабу за тое, што ён адшукаў і прадставіў на гэтай выставе дзве карціны яе бацькі. Таксама выказала словы ўдзячнасці супрацоўнікам Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, з чыёй дапамогай выйшла манаграфія пра Віталя Цвірку, ілюстраваная работамі , якія захоўваюцца ў фондах музея: дык, можа, Бог дасць, там і адкрыюць залу Цвіркі? У Міністэрства культуры краіны ўжо накіраваны ліст з адпаведнай просьбай. Праўда, карцін мастака ў сям'і засталося, на вялікі жаль, мала. Адна надзея на музейны фонд.... І, дарэчы, ўсе прысутныя за "круглым сталом" адзначалі, што такі музей ці хаця б зала, прысвечаная майстру пейзажа, у Мінску павінны быць.

• Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, дзе ў свой час выкладаў і Віталь Цвірка, падрыхтавала не адзін дзесятак таленавітых творцаў. Сёння Л. Шчамялёў, А. Ксяндзоў, Ф. Ястраб, В. Шкаруба, У. Кожух, В. Касцючэнка, С. Каткова, І. Бархаткоў, Я. Батальёнак, А. Грышкевіч і іншыя прэзентавалі свае пейзажы на гэтым своеасаблівым фестывалі, кожны паказаў уласную тэхніку, арыгінальныя кампазіцыйныя вырашэнні, а самае галоўнае — майстэрства. Многія з прадстаўленых аўтараў даўно вядомыя далёка за межамі Беларусі адметнасцю ўвасаблення вобразаў роднай зямлі, значных і непаўторных.

За "круглым сталом" выказваліся ўдзельнікі выставы, дзяліліся меркаваннямі мастацтвазнаўцы.

Валерый Жук адзначыў, напрыклад, што пейзаж — гэта лабараторыя, дзе мастаку можна сябе рэалізаваць, дзе для кожнага ёсць вялікія магчымасці — ствараць. Уладзімір Кожух лічыць, што ў розных выпадках пейзаж можа адыгрываць сваю ролю — ці другарадную, ці галоўную. Для сябе ён вызначае прыроду як галоўную лабараторыю натхнення.



Аляксандр Грышкевіч прадставіў на выстаўцы свой лірычны пейзаж: ён з дзяцінства марыў маляваць прыроду і настойліва ішоў да гэтага. "Пейзаж важны для мяне, — кажа мастак, — не толькі як куточак прыроды. Стварэнне вобраза — мая задача. Жыццё мяняецца, і мастак мяняецца. За дзень можна мяняць адну і тую ж сцэну. У маіх ранніх работах менш лірыкі, больш канструктыўна-кампазіцыйнага: паклаў мазок — і потым размазвай яго, як хочаш. Апошнім часам з'явілася больш прафесійнай упэўненасці, а гэта значыць, ёсць магчымасць больш пазнаць сябе, на што ты здольны..."

Старшыня секцыі жывапісу Беларускага саюза мастакоў Віктар Касцючэнка кожны раз адкрывае для сябе новы пейзаж, а потым зноў шукае. Так, ён заўсёды ў пошуку. Аднак лічыць, што мастака ў розных работах пазнаваць будзеш заўжды, як бы той ні эксперыментаваў, бо яго прырода застаецца нязменнай. Уладзімір Тоўсцік, які на гэтай выставе прадставіў сваю карціну "Світанак", зрабіў невялічкі агляд усёй экспазіцыі, зазначыўшы, што пейзаж звязаны з пачуццёвасцю і можа перадаваць стан прыроды, і рабіцца амаль абстрактнай з'явай, а можа быць і аналітычным — на палотнах у кожнага з мастакоў гэта можна прасачыць.

Арганізатару гэтай выставы Фёдару Ястрабу дзякавалі ўсе. Найперш за тое, што ён паставіў пытанне наконт вызначэння ролі і месца творчай спадчыны Віталя Цвіркі, папулярызацыі яго творчасці. Сам Ф. Ястраб прадставіў гледачам два пейзажы: "Час ягад" і "Летні дождж". Ён лічыць, што ў жанры пейзажа прыйшоў час выказвацца не праз фатаграфічны адбітак вобраза прыроды, а праз пачуццёвае ўспрыманне яе стану. Сучаснаму пейзажу павінна адпавядаць сучасная пластыка, канкрэтны вобраз мусіць саступіць месца эмацыянальна-пачуццёваму вобразу, асацыятыўнаму. Ларыса Міхневіч адзначыла, што жанр пейзажа — старадаўні жанр, на Усходзе вядомы з IV стагоддзя. Гэты від мастацтва заўсёды быў актуальны, бо прырода, "напісаная рукою", заўсёды выклікала цікавасць на ўсіх кантынентах. Сёння існуе эка-арт — мастацтва актуальнай пазіцыі ў традыцыйнай форме. Рынак дыктуе мастакам, як і раней, і пейзаж на ім сёння лідзіруе.

•А я, прысутная на той мастацкай імпрэзе, падкрэсліваю, што пейзаж як жанр — усеабдымны. Час ідзе, і усё ў творчасці нібыта мяняецца. Але застаецца класіка. І добра было б, каб усё ж мы маглі прыходзіць у музей, ці хаця б у залу Віталя Цвіркі і глядзець, любавацца на яго палотны, ля якіх мастакам малодшага пакалення можна і павучыцца. Павучыцца панарамнасці кампазіцыі, эпічнасці пейзажа з вольнай жывапіснай манерай і тонкай каларыстычнай палітрай. Мастацкая спадчына вялікага майстра разнастайная: пейзаж, нацюрморт,тэматычная карціна, партрэт. Тэхніка выканання — віртуозная: ці то алейны жывапіс, ці то акварэль, ці то тэмпера...

У хуткім часе арганізатары гэтага фестывалю прапануюць нам новую выставу. А "Фестываль пейзажа" плануецца ўжо ладзіць кожны год і нават запрашаць на яго замежных мастакоў.

Галіна ФАТЫХАВА

Фота забяспечана аўтарам

ХАТНІ ДАРАДЦА

"Крымская старонка" з успамінаў пісьменніцы Алены Васілевіч; эсэ і нататкі тэатральнага крытыка Барыса Бур'яна; нарысы да 120-годдзя кампазітара Міколы Равенскага і 100-годдзя акцёра Кастуся Быліча; чытанка для дзяцей; краязнаўчыя экскурсы; гістарычныя звесткі пра страчаныя архітэктурныя каштоўнасці нашай зямлі; узоры са скарбонкі народных назіранняў ды іскрынкі гумару ... І яшчэ шмат іншай пазнавальнай інфармацыі, а таксама карысных парад на розныя жыццёвыя выпадкі змяшчае чарговае, на 2006 год, выданне календара "Родны край" (рэдактар-складальнік Валянціна Пінчук). Такі насценны адрыўны каляндар — карысная і зручная рэч, незаменны спадарожнік будняў і святаў у кожным беларускім доме. Бо нагадае ён і пра адметныя дні дзяржаўных і рэлігійных урачыстасцей, і пра знамянальныя даты нашай культуры і навукі, і пра з'явы астранамічныя, уплыў якіх распаўсюджваецца менавіта на тэрыторыю Беларусі. Выйшаў каляндар "Родны край", як і раней, у выдавецтве "Беларусь". Яго выпуск ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

С.Б.

Фота забяспечана аўтарам

ІХ ВУЧАЦЬ СПЯВАЦЬ

У дні, калі Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў адзначае юбілей, успамінаецца сёлетні экзамен па вакале, які трымалі студэнты-першакурснікі тэатральнага факультэта. Праходзіў ён у шматлюднай і святочнай абстаноўцы. "Пахварэць" за будучых артыстаў тэатра і кіно прыйшлі іх сябры, бацькі. Асабліва ж хваляваліся педагогі: вядомая оперная салістка, дацэнт А.Шведава, яе памочніца, артыстка Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра К.Дзегцярова, канцэртмайстар — галоўны канцэртмайстар Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек Л.Чаранок...

Незвычайны экзамен быў прысвечаны 60-годдзю Вялікай Перамогі і 80-годдзю выпускніцы першага набору на тэатральны факультэт прафесара Э.Герасімовіч. На імправізаваную сцэну выходзілі студэнты, з хваляваннем спявалі блізкія людзям розных пакаленняў песні пра Вялікую Айчынную. Нікога не пакінула абыякавым іх вобразная інтэрпрэтацыя сённяшнімі 18-гадовымі. Палова студэнтаў раней ніколі не займалася музыкай, спевамі. Але А.Шведава знайшла падыход да моладзі, стварыла методыку засваення рэпертуару ад простага да найбольш складанага.

Падчас экзамена, які так і хочацца назваць канцэртам, гучалі вядомыя песні: "Давай закурым", "Цёмная ноч", "У зямлянцы", "Песенька франтавога шафёра", "Жураўлі"... З нуля асвоіўшы вакал, Д.Мухін паказаў бліскучае выкананне; натхнёная А.Шчарбак выглядала сапраўднай "зоркай". Студэнт Г.Гаранскі выйшаў у вайсковай форме, з рэч-мяшком і спяваў пранікнёна, стварыўшы жывы вобраз салдата той вайны і расчуліўшы публіку да слёз. Уладальніку прыгожага барытона А.Рудэню нават прапанавалі заняцца спевамі прафесійна.

Прысутнічаў там і ўдзельнік Вялікай Айчыннай, кавалер трох ордэнаў Чырвонай Зоркі, бацька спявачкі-педагога, — У.Шведаў. Ён слухаў знаёмыя песні ў выкананні студэнтаў, успамінаў... Радаваўся за дачку, якая за 5 гадоў выкладання ў акадэміі дасягнула педагагічных поспехаў.

Вера КРОЗ

Пераважная большасць з нас (Мы ў дадзеным выпадку — гэта сучаснікі-суайчыннікі як збіральны "вобраз-персанаж") выпрацавалі адну з самых каштоўных для выжывання ў вірлівым *сёння* здольнасцей — здольнасць не заўважаць складанай сітуацыі там, дзе яна не проста ёсць, але пагражае незваротнымі наступствамі. Напрыклад, любы, хто мае дачыненне да бягучага літаратурнага працэсу, амаль фізічна адчувае, як паскараецца яго герметызацыя: сустрэча жывога пісьменніка з рэальным чытачом пачынае ўсведамляцца як сапраўдная ўдача, бо для першага "шырокая чытацкая аўдыторыя" паўстае прывідам, а для другога існаванне "сучаснага беларускага літаратара" падаецца амаль містыфікацыяй.

Калі ніхто не сумняваецца ў тым, што Чалавека (асобу, грамадзяніна, патрыёта і г.д.) трэба выхоўваць, дык ці варта браць пад сумненне такую ж відавочную неабходнасць выхоўваць Чытача (праніклівага, чулага, эстэтычна падрыхтаванага і да т.п.), што здолеў бы адэкватна ўсведамляць заканамернасці і варункі сённяшняй мастацкай славеснасці?

Пытанне гэтае, насуперак цвярозаму розуму і культурнай логіцы, далёка не рытарычнае (заўважым, — не толькі для беларускай літаратурнай прасторы). Складанасць праблемы, бадай, абвострана адчуваюць тыя пісьменнікі, што маюць стасункі (у тым ліку — прафесійна-педагагічныя) са школьнай і студэнцкай аўдыторыяй, прадстаўнікі якой (анекдатычны, але далёка не адзінкавы выпадак!) найчасцей не могуць назваць ніводнага прозвішча сучасных трыццаці-, сарака-, пяцідзесяцігадовых літаратараў... Атрымліваецца, што ва ўяўленні нашых патэнцыяльных чытачоў НЯМА не толькі ніводнага схільнага да парадаксалізму творцы, а і цэлых літаратурных пакаленняў!..

"ЛіМ" наважыўся замест адзінкавых рэплік у СМІ, спарадычных выступленняў спецыялістаў на нарадах ды канферэнцыях па праблемах суадносін сучаснай мастацкай літаратуры і сучаснай жа адукацыі (розных ступеняў) прапанаваць сваім чытачам панарамнае бачанне сітуацыі; якраз з гэтай мэтай было прапанавана выкладчыкам, настаўнікам, пісьменнікам, студэнтам, выдаўцам і проста людзям неабыякавым адказаць на наступныя пытанні:

1. Наколькі з вашага пункту гледжання змест падручнікаў па беларускай літаратуры адлюстроўвае сучасны літаратурны працэс?

2. Не падаецца вам, што школьнікаў, асабліва падлеткаў, лепш пачынаць знаёміць з нацыянальнай літаратурай праз творы займальна-прыгодніцкага жанру, каб спачатку зацікавіць, а пасля навучыць?

3. Ці павінен падручнік выглядаць як мастацкі твор?

4. Як павінен быць арганізаваны вучэбны (крытычны) матэрыял падручніка і якой мовай напісаны?

Менавіта вашае меркаванне можа стацца самым важкім.

РЭДАКЦЫЯ

Марыя ВЕРЦІХОЎСКАЯ,
выдатнік адукацыі БССР

1. Мяркую, што адлюстроўвае. Трэба ўлічваць, што ўсіх сучасных пісьменнікаў і ўсе творы ў гэтым раздзеле падручніка ахапіць немагчыма. Акцэнт неабходна рабіць на самыя значныя з'явы ў сучасным літаратурным працэсе і на адметныя асаблівасці стылю тых пісьменнікаў, творчасць якіх аналізуецца. Зноў жа суб'ектыўны фактар і ў гэтай справе, бадай, ці не вызначальны: многае, калі не ўсё залежыць ад асобы літаратуразнаўцы, ад таго, хто адлюстроўвае сучасны літаратурны працэс і адаптуе інфармацыю для школьнага падручніка. У мяне больш заўваг і пажаданняў нават не да зместу, а менавіта да формы і стылю адлюстравання сучаснага літаратурнага працэсу ў школьных падручніках. Аднак гэта тэма празмерна шырокая і надта балючая, каб здолець яе раскрыць, адказваючы на пытанне.

2. Калі гаварыць пра "зацікавіць, а потым навучыць" як метадычны прыём, то ён надзвычай дзейсны, і, мяркую, з гэтым ніхто спрачацца не будзе. Менавіта так і робяць самыя лепшыя настаўнікі-творцы. Яны не пачынаюць працу з тэкстам, аналіз мастацкага твора, урок увогуле, пакуль не зацікавяць вучняў тым, над чым ім належыць шчыраваць на ўроку, — не дасягнуць высокага ўзроўню матывацыі. У кожнага настаўніка — свае прыёмы, свае залацінкі-сакрэты, каб прымусіць вучняў з захапленнем рабіць тую справу, якую без належнай матывацыі яны палічылі б нудотнай і нават ненавіснай.

Згадайма, як адзін славуты настаўнік, перш чым даваць тэму "Аб'ём шара", убег у клас (быццам крыху спазніўшыся!) з двума кавунамі ў сетцы-авосьцы. Проста з рынку — на ўрок! І стаў прасіць у вучняў дапамогі: ці не пралічыўся, купіўшы два невялікія? Можа, было б выгадней — адзін вялікі? І як жа яны шчыравалі! Апамяталіся, калі "вынайшлі" формулу аб'ёму шара...

І ў настаўніка літаратуры досыць сваіх "кавуноў", каб зацікавіць, а потым навучыць. Што да гэтага прынцыпу адносна зместу праграмы па літаратуры, то тут патрэбны мудрасць, абачлівасць і асцярожнасць. Каб не трапіць у пастку ўласных гульняў, пагоні за лёгкім і цікавым. У рэшце рэшт, так яно ўжо і атрымалася, прычым у велізарных маштабах. Сучасны чытач трапіў у пастку літаратурнай вольнасці. Ён настолькі разбэсціўся лёгкім цікавым "чцівам", якое падсунулі яму аўтары дамскіх бестселераў і "іранічных дэтэктываў", што ўжо не здольны чытаць прыстойную, самавітую літаратуру. І мы яшчэ ахнем ад таго, што ўчынілася і адбываецца зараз, але будзе позна: працэс пайшоў! Гэта не літаратура, гэта — куча. Патлумачу. Прымусіла сябе прачытаць адзін "іранічны дэтэктыў" сумнавядомай "жрыцы" літаратуры і налічыла ў ім каля сотні разоў ужытага слова "куча". Ім аўтарка аздабляе, як эпітэтам, не толькі канкрэтныя прадметы: куча грошай, прысмакаў, палюбоўнікаў, аўтамашын, бранзалетаў і да т. п., але нават абстрактныя паняцці: куча эмоцый, страсцей, нерваў, клопатаў і нават куча ... розуму! Дык вось такую літаратуру (займальна-прыгодніцкую, заўважым!) з поўным правам можна назваць адной вялікай кучай. І хто ў тую кучу ўваліўся, яму ўжо з яе не выбрацца...

Каб не атрымалася так, што, кіруючыся неблагім прынцыпам "зацікавіць, а потым навучыць", мы ператворым літаратурную адукацыю ў калектыўны паход да "кучы". Ці так ужо і шмат у нас высокамастацкіх твораў займальна-прыгодніцкага жанру? Я зусім не супраць уключэння ў праграму добрых твораў такога кшталту. Наадварот. Колькі разоў я даводзіла, што тое ж "Дзікае паляванне..." неабходна адаптаваць (скараціць) для тэкстуальнага вывучэння ў 5-м, да прыкладу, класе. Гэта вельмі неразумна і неашчадна "кідацца" такімі творамі і рэкамендаваць іх толькі для пазакласнага чытання (а гэта значыць, што яны фактычна не вывучаюцца ўвогуле). Стукаюся я і цяпер ва ўсе дзверы і пераконваю каго толькі можна, што федарэнкаўскія аповесці "Тры талеры" і "Афганская шкатулка" варта таксама адаптаваць для тэкстуальнага вывучэння ў 5—7 класах. Нават гэтых прыкладаў дастаткова, каб давесці: я не вораг займальнаму і прыгодніцкаму на ўроках літаратуры. Пры адной толькі ўмове: калі яно — высокамастацкае.

Больш за тое, я глыбока пераканана, што ўрок літаратуры можа і павінен быць таксама цікавым. І вядома ж, гэта ў многім залежыць ад таго, які твор вывучаецца. Літаратурны твор для ўрока літаратуры — тое ж, што і добрая драматургія для тэатра. Ніякімі намаганнямі рэжысёра і акцёрскімі талентамі не ўратаваць спектакль ад правалу, калі п'еса кепская, слабая, хадульная, прымітыўная. Гэта сцвярджэнне актуальнае і для ўрока літаратуры. З адной толькі агаворкай — гледзячы, што лічыць цікавым. Бо і ад таго, які твор сам настаўнік лічыць цікавым, вельмі многае залежыць на ўроку. Да, прыкладу, маё асабістае меркаванне, што самым цікавым творам у беларускай літаратуры з'яўляецца паэма "Новая зямля". І я маю падставы лічыць, што з такім перакананнем выйшлі са школы многія мае вучні. Калі ж яны ўпэўнены, што паэма "Новая зямля" — "пра цяжкае гаротнае жыццё сялянства да рэвалюцыі", то — бяда. Такую сітуацыю не паправіць нават заменай "Новай зямлі" на самы займальна-прыгодніцкі твор. Але гэта ўжо датычыцца праблемы выкладання літаратуры, а не зместу праграмы па літаратуры.

3. Мне падаецца, што падручнік па літаратуры (яго аналітыка-дыдактычны змест) — не мастацкі, а навукова-папулярны эўрыстычны, публіцыстычны і дыдактычны твор. Іншая справа, што добрая публіцыстыка, а тым больш — для дзяцей, патрабуе таленту і майстэрства не менш, чым высокамастацкі твор. Перафразуючы ўсім вядомы выраз, скажам: падручнік трэба пісаць так, як высокамастацкі твор, толькі яшчэ лепш. А ці будзе ён адпаведна "выглядаць" — справа дзесятая. На пытанне, якім павінен быць падручнік, у тым ліку і па літаратуры, адказана даўно, некалькі стагоддзяў назад. І адказ той добра вядомы ўсім: — "варотамі вучонасці" павінен быць падручнік. Вучонасці не ў прамым, канкрэтным сэнсе, вядома. А ў шырокім: вучонасць як навука жыцця, спасціжэння законаў вечнасці. У нас такія багатыя традыцыі напісання добрых падручнікаў! Удумаемся толькі: два з трох падручнікаў, якія Ламаносаў назваў "вратамі" сваёй вучонасці, напісаны беларускімі вучонымі — Сімяонам Полацкім і Мялецієм Смятрыцкім! Па літаратуры і мове адпаведна. На вялікі жаль, многія аўтары сучасных падручнікаў з ламаносаўскага афарызма быццам за накірунак для сябе ўзялі не першае, а другое слова — "вучонасць". Яны ўпусцілі адну драбніцу: гэта не пра іх, аўтараў, вучонасць ідзе гаворка. Яны ж проста спаборнічаюць: хто "вучоней" скажа і напіша для дзяцей. Сучасныя падручнікі нават не навуковыя, а "занавучаныя". У іх аўтары не "вучаць вучыцца", не дапамагаюць вучыцца, не стымулююць да вучобы і пошуку, а дэманструюць уласную вучонасць. Часам падручнікі ці метадычныя дапаможнікі для настаўнікаў уяўляюць сабой неадаптаваныя дысертацыі ці ў лепшым выпадку — іх фрагменты, прычым, мова гэтых "дысертацый" — дубовая.

4. Па прынцыпе: "неабходна і дастаткова". Толькі тое, што неабходна, каб на матэрыяле падручніка як на падмурку вучань будаваў Храм уласнай душы і розуму. Рэалізацыі гэтага прынцыпу паспрыялі б эўрыстычная накіраванасць і змест дыдактычнага матэрыялу. Эўрыстычны змест падручніка, на маю думку, дасягаецца праз гармонію даступна пададзенай інфармацыі (толькі неабходнай і дастатковай!) і арыентацыйных заданняў. Прычым, пададзеных і сфармуляваных па закону: спачатку думай, а потым навучыся, а не наадварот. Што да мовы падручніка (а мова — сапраўды першааснова і мастацкага твора, і падручніка таксама), то найлепш гэта сказаў расійскі пісьменнік А. Бітаў. У эсэ "Русский устный и русский письменный" ён піша: "Учебник писать — подвиг. Довести что-то до прозрачности и ясности, не унизив свою тему и не упростив предмет, — это невероятный подвиг слова." На думку А. Бітава, умовай здзяйснення такога подзвігу з'яўляецца папулярызацыя. Нельга не пагадзіцца з ім, што ў наш час узнікла вострая неабходнасць і патрэба ў папулярызацыі. "Популяризация" теперь стала закавыченным словом, стала одной из униженных истин, — піша А. Бітаў, — хотя популяризация ведь... не шарлатанство, а способ просто, честно и справедливо объяснить, что именно ты делаешь.." І сапраўды. Проста — не азначае спрошчана. Прастата, яснасць, даступнасць — візітоўка аўтара ва ўзаемаадносінах з карыстальнікам падручніка. Проста, на думку Бітава, — гэта папулярна, "способ просто, честно и серьезно объяснить, что именно ты делаешь... Упрощение — не такая уже простенькая вещь. Когда ясно объясняешь суть того, о чем думал десятилетиями, незнающему, мысль становится богаче. Такая популяризация — точеный, сильный мускул самой сути."

Настойліва даводзіць Бітаў, "что привлечь-то надо к составлению школьных учебников самые гениальные умы... Вот авторов этого жанра я бы избирал на государственном уровне. С очень высоким премиальным фондом. С очень большой честью и почестями. ... Потому что это сверхзадача для настоящего ученого."

На вялікі жаль, пакуль што ў нас напісанне падручнікаў — нейкі апошні жанр. Сапраўды, апошні павінен стаць першым.

Мяркую, вучэбны матэрыял павінен быць арганізаваны да ўсяго яшчэ так, каб забяспечыць канцэптуальнасць падручніка. І вось у гэтым плане канцэптуальнасць — тое, што абавязкова як для мастацкага твора, так і для падручніка як твора выключнага па сваім жанры. Мне падаецца, што ў нас ужо ёсць некалькі падручнікаў, якія вылучаюцца сваёй канцэптуальнасцю — падручнік для 3-га кл. А. Клышкі, падручнік па беларускай літаратуры для 6 кл. А. Бельскага і Л. Цітовай. І гэта дае падставы спадзявацца, што "апошні" жанр стане нарэшце некалі першым.

Таццяна МАРОЗ,
кандыдат педагагічных навук,
вучоны сакратар Нацыянальнага
інстытута адукацыі

1. На маю думку, змест падручнікаў па беларускай літаратуры яшчэ недастаткова адлюстроўвае сучасны літаратурны працэс. Зразумела, што колькасць гадзін на вывучэнне літаратуры абмяжоўвае аўтараў падручнікаў, не дае магчымасці паўней паказаць шматграннасць сучаснага літаратурнага працэсу, увесці новых аўтараў. Часткова гэтую функцыю выконваюць хрэстаматыі па беларускай літаратуры серыі "Школьная бібліятэка" і кнігі пазакласнага чытання.

Выйсце мне бачыцца перш за ўсё ў пераглядзе сістэмы літаратурнай адукацыі ад пачатковай школы да старшай ступені. Яна павінна быць непарыўная , з захаванням пераемнасці ў навучанні, пазбаўленая дубляжу. Курс пачатковай літаратурнай адукацыі (1 — 4 класы) павінен быць сістэматызаваным. У 1 — 3 класах вучні могуць пазнаёміцца з фальклорам, народнымі і літаратурнымі казкамі, прыгодніцкімі творамі, а ў 4 класе — сістэматызаваць свае веды па літаратуры ад першых твораў для дзяцей да сучасных. У аўтараў чытанак для пачатковай школы ёсць магчымасць перагледзець змест хрэстаматый, пазнаёміць дзяцей з творамі У. Ягоўдзіка, Л. Рублеўскай, Л. Пранчака, У. Ліпскага, Т. Мушынскай, А. Бадака і інш.

2. Знаёмства з нацыянальнай літаратурай праз цікавыя, адпаведныя ўзросту творы займальна-прыгодніцкага жанру неабходна пачынаць значна раней, з пачатковай школы, тады сфарміруецца правільны тып чытацкай дзейнасці мэтанакіраванага асэнсавання кніг дзецьмі (ад абавязковых ведаў да пабудовы траекторыі індывідуальнага літаратурнага развіцця).

3. Падручнікі, на маю думку, павінны быць прыгожымі, добра ілюстраванымі. Яны дапамагаюць вучням увайсці ў свет мастацтва слова, адкрываюць новыя гарызонты для эстэтычнага і літаратурнага развіцця асобы.

4. Вучэбны матэрыял падручніка фарміруе ў вучняў функцыянальную адукаванасць, самастойнасць мыслення, чытацкі густ, таму ён павінен быць арганізаваны з улікам узроставых асаблівасцяў і пазнавальных інтарэсаў сучаснага школьніка, пазбаўлены празмернай навуковасці.

Аксана Навіцкая,
студэнтка філалагічнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага універсітэта

1. Безумоўна, у любым падручніку немагчыма ў поўнай меры адлюстраваць усе нюансы і асаблівасці сучаснага літаратурнага працэсу, зыходзячы з яго разнастайнасці і шматаспектнасці. Можна гаварыць пра асвятленне толькі найбольш значных яго тэндэнцый, тыпаў і праяў.

2. У такім меркаванні маецца рацыянальнае зерне, паколькі стваральнікам падручнікаў і настаўнікам неабходна ўлічваць інтарэсы вучняў. Тым больш што займальна-прыгодніцкія творы ў беларускай літаратуры ёсць, і гэты жанр актыўна развіваецца ў наш час.

3. Падручнік перш за ўсё павінен заставацца падручнікам, паколькі ствараецца на навуковай аснове, але пэўныя новаўвядзенні і сучасныя тэхналогіі таксама не лішнія, зноў жа, каб выклікаць цікавасць падлеткаў і стымуляваць іх жаданне вучыцца.

4. На мой погляд, падручнікі неабходна пісаць у навукова-папулярным стылі, даступнай і зразумелай мовай, абапіраючыся на факты і найбольш яркія прыклады і з'явы, прычым матэрыял павінен падавацца такім чынам, каб актывізаваць крытычнае мысленне школьнікаў, навучыць іх самастойна рабіць абагульненні і падводзіць вынікі, аналізаваць тэкст.

У. МАЦВЕЕНКА

ЗАГАДКІ-МЕТАГРАМЫ

Яго
У лесе
Ты сустрэнеш,
Ён грыбніку
Прыемны дар.
Ледзь толькі
Б на М заменіш,
Дык ляжа
Клоуну на твар.

(Грыб. Грым.)

* * *

Раніцай
Ён прылятае
І жах
На жабак
Наганяе.
А той, хто
Ў на Н заменіць,
Адразу
Камень атрымае.

(Жораў. Жоран.)

* * *

З нараджэння
Вельмі колкі,
Носіць на сабе
Іголкі.
О на У заменіш
І...
Ён ужо
Радня змяі.

(Вожык. Вужык.)

* * *

Глянеш справа,
Глянеш злева
Ўсё адно,
Ён рэштка дрэва.
Ч на Т
Заменіш лоўка
Зірк —
Спартыўная
Пляцоўка.

(Корч. Корт.)

На ўроку
(смяшынкі)

* * *

Настаўнік:
— Вельмі непрыемна, але прыйдзецца паставіць табе двойку.
Вучань:
— Каб вам было прыемна, пастаўце пяцёрку.

* * *

— Калі адбылася Грунвальдская бітва? — спытаў настаўнік у вучня.
— Даўно.
— Як даўно?
— Вельмі даўно.
— Хто з кім ваяваў?
— Праціўнік з праціўнікам.
— Хто перамог?
— Мацнейшы.

* * *

Настаўнік:
— Хто пабудаваў егіпецкія піраміды?
Вучань:
— Вядома, археолагі!

* * *

— Табе дапамагаў тата вучыць урокі?
— спыталі ў Кастуся.
— А як жа! Я пісаў, а ён стаяў каля мяне з папружкаю.

Мікола ТОНКАВІЧ

Сцізорык

Мне купіў сцізорык тата.
Ну і радасці ж было!
што такім я стаў
багатым.
Хутка знала ўсё сяло:
Аднагодкі-дружбакі,
Нават іхнія бацькі
Бо сябры бацькоў прасілі,
Каб і ім такі ж купілі.

Лёля БАГДАНОВІЧ

Пацеркі-агеньчыкі

Разам з цёткаю Арынай
Я збіраю журавіны.
Лесавік там чараваў
У балоце прыцемкам,
Ды ў зялёны мох кідаў
Пацеркі на ніцейках.
Спелай чырванню гараць
Сонейка праменьчыкі.
Не лянуюся збіраць
Пацеркі-агеньчыкі.



Знайдзіце "лішні" малюнак у кожным радзе.

Валянцін ЛУКША

БУСЛЯНКА

Цішыня у вёсцы ранкам,
Стала пуста у двары —
Зноў пакінулі буслянку
Дзіва-птушкі на зары.



Мал. М. ЛАЙКОВАЙ

Тата на бярозу кола
Напрадвесні усцягнуў:
— Будзе дзе буслам вясёлым
Сёлета страчаць вясну.

Красавіцкі чысты вечар.
Клёкат вёску абудзіў,
І буслы сабе гняздзечка
Ладавалі ад зары.

Над вясковай нашай хатай
Мітусня і неспакой:
Запішчэлі бусляняты —
Змена шумная бацькоў.

Потым над ракой крыляла
Пара птушак дацямна.
Той куточак вывучала,
Дзе чакае іх вясна.

Каб ізноў буслінай песняй
Край жаданы адарыць,
Каб ключы вясны прынесці,
Зноў буслянку абудзіць.

Міхась ПАЗНЯКОЎ

Сапраўдныя сябры

Казка



Вожык Тапатулька ў які ўжо раз вяртаўся з грыбной вандроўкі ў сваю ўтульную хатку пад старой кашлатай ялінай. У руках ён нёс поўны кошык баравічкоў. Некалькі грыбкоў калючы руплівец накалоў нават на свае вострыя іголкі. Восень выдалася ўраджайная, і таму ён стараўся як след падрыхтавацца да зімы — забяспечыць сябе харчовымі запасамі.

Раптам вожык пачуў нейчы плач. Паставіў кошык пад асінку, а сам хутчэй пабег на той плач. Неўзабаве ўбачыў на пянёчку вавёрачку Крылатку, каля якой стаяў поўны мяшочак арэхаў.

— Што здарылася, суседачка? Чым дапамагчы табе?

— Ой, горачка мне, гора! — яшчэ мацней заплакала вавёрачка. — Спілавалі маю сасну з дуплом на дровы. Дзе ж я цяпер жыць буду? Куды свае арэшкі складу? Няма ў мяне больш хаткі.

— Эх, сапраўды бяда вялікая, — уздыхнуў вожык. — Ды не плач, Крылатка. Я дапамагу табе. Пайшлі, будзеш у мяне жыць.

Ускінула вавёрачка на плечы мяшочак з арэхамі, вожык забраў свой кошык з грыбамі і пакрочылі яны далей. Спыніліся нарэшце пад высокай разлапістай ялінай.

— Вось і маё жытло, — сказаў Таптулька, — паказваючы на невялікую двухпавярховую хатку. — Мне хопіць першага паверха, а ты, Крылатка, займай другі. Жыві сабе на здароўе.

Узрадавалася вавёрачка. Паднялася па лесвіцы на другі паверх. Паставіла мяшочак з арэхамі ў куточак, лягла на канапку і, зморана, хутка заснула. Вожык нават не стаў будзіць яе на вячэру.

Уночы прачнулася Крылатка ад моцнага шуму. Хтосьці бегаў каля яліны, стукаў па даху, зазіраў у акенца. Гэта ліса завітала. Вожык у клубок згарнуўся, уваход закрыў калючкамі, вавёрачку ад небяспекі ратуе. А тая спалохалася, выскачыла праз акенца — ды на яліну. «Не, — думае, — не для мяне такое жытло, трэба ўцякаць. Адно толькі мяшочка з арэхамі шкада».

Цэлы дзень шукала Крылатка новага прытулку, але так і не знайшла. Села на палянцы, зноў заплакала. Пачуў яе барсук і пытае:

— Што здарылася, Крылатка?

Расказала яму вавёрачка пра сваё гора.

— Не плач, — супакоіў барсук. — Пайшлі ў маю хатку, перазімуеш.

Прывёў барсук Крылатку ў сваю глыбокую нару. А там цёмна, сыра, страшна. Пасядзела крышачку ды ходу з нары. Доўга скакала па лесе. Спынілася на старой сасне: рашыла заначаваць тут. Пралятала міма сава, пытае:

— Ці не заблудзілася ты, Крылатка?

Паведала вавёрачка і ёй пра сваё гора-горачка.

— Свет не без добрых сяброў, — заспакоіла сава. — Адпачывай спакойна, а заўтра нешта прыдумаем...

Усю ноч пралятала сава, — шукала дзятла — майстра знакамітага. І сароку, і жаўну разбудзіла, але тыя не ведалі, дзе знайсці дзятла. Паляцела да вожыка Таптулькі, той і падказаў, дзе раніцай будзе працаваць дзяцел. І сапраўды, калі ўзышло сонца, яны пачулі яго стук. Паляцела сава на перамовы. Выслухаў майстар саву і адразу ж за работу ўзяўся. Расшырыў на сасне дупло, якое паказала яму сава, і такая хатка атрымалася — залюбуешся. Вавёрачка аж войкнула ад захаплення: прасторна, утульна, кладовачка збоку. А тут і вожык завітаў, прынёс яе мяшочак з арэхамі.

А праз некалькі дзён запрасіла Крылатка ў госці сваіх верных сяброў. Торт са свежых арэхаў згатавала, грыбоў і ягад насушыла. Частавала пад сасной, разаслаўшы абрус на імху. І вожык, і барсук, і сава, і дзяцел былі рады, што не пакінулі вавёрачку ў бядзе. Але больш за ўсіх радавалася сама гаспадынька.



Малюнкі Р. Куліковай

Лістападаўскі дзень напоўнены ціхім унутраным святлом. Быццам нехта з высокага-высака прасвечваў туман нябачным ліхтаром. Такім святлом, як задуменна кажа Марыя Андрэеўна Янішчыц, быў напоўнены і той дзень, калі нарадзілася яе Жэня, знакамітая беларуская паэтка, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы.



Добры дзень, Васіль!
Вось і дамялілася нагвоздзі на „ны".
Адгрымела твой лёт, за дні шчыра-шчыра дзякуй. Благ-тала твой лёт і вецьцем ламка марагілася — такі ён актэн і шчыры, як і сам паэт.
Што ў мізе мовемкага? Дайць, вёна, шчо светлымі ціплымі ўварвалася ў мой сорс і вёрш. Дазумеш, не маю не лізаць. Дзідна нязк, навам, шчо вёрш лішуцца так лёгка. Лагнімаю, гівім, адгайваюцца, калі такаў лёгкім і не прывёла да гаю нівуры... Дзіто, цёім так лёгка пішацца?! Дзіт-змахтуцца пад „лінёкім" паэтыцы. Ні заінвамшца і цуўдзім. Ні вялікі гівіі, і сафтмаа вёдаіз Лоі і шчыра кантнізмі. Бунадкім Жэні, глдёзі „Ліі". Там павінім шчыма.

СВЯТЛО ЛІСТАПАДАЎСКАГА ДНЯ

У кожнай бібліятэцы Піншчыны ёсць выстава, прысвечаная яе паэтычнай лірыцы аб каханні. Гэтая лірыка і праз гады вабіць, прыцягвае, прымагнічвае чытачоў. У яе вершы ўваходзіш адзін раз і застаешся там назаўсёды.

Як паведамілі мне супрацоўнікі раённай бібліятэкі, якая носіць Жэніна імя, яе зборнікі маюць звычай знікаць:

— У продажы іх ужо даўно няма, а прыхільнікаў з кожным годам не менее, таму за такой выставай трэба вока ды вока...

...Шэрым інеем прыбрана наваколле. Цёмная стужка шашы кружляе ўздоўж шырокай даліны Ясельды, нанізвае на сябе нібы пацеркі палескія вёскі. Вось і Велясніца, радзіма Жэні. Праўда, нарадзілася паэтка побач, у вёсцы Рудка. Потым ужо сям'я пераехала сюды.

...У хаце цёпла.

— Толькі што ў печы вытапіла, — гаворыць Марыя Андрэеўна, запраўляючы белую-белую пасму і некалі чорных валасоў пад хусцінку. Усяго хапіла ў жыцці гэтай жанчыны. Што б пераважыла, калі ўскласці на вагі радасць і смутак, хто яго ведае. Успаміны пра дачку — гэта таксама і шчасце мацеры, і вялікі жаль. Бо яна перажыла сваю слязіначку, якая так заўчасна сышла з гэтага свету, пакінуўшы матулі адны ўспаміны...

— Прыехала з Пінска Таня, мая ўнучка, гэта Мішава дачка...— апавядае Марыя Андрэеўна. Сам Міхаіл Іосіфавіч — яе сын, ён старэйшы за Жэню на чатыры гады, сядзіць непадалёку, і яго рукі "вымалёўваюць" ладны кошык з доўгіх, гнуткіх пруткоў. — Дык вось, прыехала Таня акурат перад Вялікаднем, і як заўсёды ўзяліся мы за прыбіранне. Тое, што непатрэбна, стала яна насіць на гарышча. Крычыць адтуль:"Бабуля, я тут нейкія сшыткі знайшла. Мабыць Жэніны, бо ўсе паўнюткія вершаў". Падавай сюды, гавару ёй. І сапраўды, яе сшыткі. Гэта калі мы пераязджалі з Рудкі, а было ўсё ў 1967 годзе, дык многае што з рэчаў паклалі на гарышчы ўжо новай хаты. Самая лепшая схованка. На гады. Але хто думаў, што яны там захаваліся. Колькі часу прайшло. Амаль сорак гадоў тым сшыткам, Жэнькі няма, а яны жывуць. Усё, што з ёю звязана, жыве. І дзякуй людзям.

— Чаму ж не паважаць, талент ёсць талент, — уключаецца ў нашу размову суседка, таксама Марыя. — Ты вось пра сшыткі гаварыла, дык яна тады ўжо так сачыняла, так сачыняла, ад чаго нашы вялікія пісьменнікі былі ў захапленні, што на Палессі вельмі таленавітае дзіця з'явілася. Хто ёй у тыя часы толькі ні пісаў: і Ніл Гілевіч, і Пімен Панчанка...

— Так-так, — згаджаецца Марыя Андрэеўна, — але больш за ўсіх Ніл Сымонавіч, ён для яе як бацька быў, сапраўдны паэтычны бацька, дай Бог яму здароўя. Чула, што ён трохі занямог. А ў сшытках многае з таго, што так і не выдавалася. Жэня гаварыла, над імі трэба яшчэ працаваць. А пачынала працаваць, дык мімаволі складала новыя... Яна калі сядзела над якім-небудзь вершам, то хоць табе хата гары, нічога не заўважыць.

У пажоўклых, дзе-нідзе выбеленых часам школьных сшытках роўныя , акуратныя радочкі вучаніцы Парачанскай сярэдняй школы.

У сшытках многа прысвячэнняў не толькі маці, але і школьным сябрам, настаўнікам, суседзям, берасцейскім паэтам... Дакранаешся, чытаеш і адчуваеш, чаму ўжо з таго часу такім нязгаслым святлом стаў да краёў паўнюткі гэты дзень.

Кожны год адна з лістападаўскіх нядзель на Піншчыне проходзіць пад знакам творчасці паэткі-зямлячкі. Частымі гасцямі на іх паэты, літаратуразнаўцы са сталіцы рэспублікі і ўсёй Беларусі... Фінал — вялікае паэтычнае свята. Яно штогод адбываецца пад патранажам Пінскага райвыканкама ў вёсцы Велясніца напрыканцы лістапада.

А цяпер — вершы са знойдзеных на гарышчы сшыткаў Жэні Янішчыц. Не забываючы, што перад намі выпускніца сярэдняй школы, якая знаходзілася толькі на пачатку сваёй паэтычнай творчасці, усё ж адзначым даволі высокі ўзровень яе літаратурнага майстэрства, парадуемся нечаканай неардынарнасці мілагучных рыфмаў ды яркай расквечанасці метафарычных вобразных знаходак. Гэта яшчэ раз пераконвае ўсіх нас у вялікай адоранасці і Боскім таленце знакамітай "палескай ластаўкі".

Мікалай ЕЛЯНЕЎСКІ,
член Саюза пісьменнікаў Расіі.

Маці

Калі дажджы закончацца нарэшце
І стане неба палявой валошкай,
Гляджу, як маці сее жыта ў рэшаце,
Як круцяцца на фартуху гарошыны,
А твар вясёлкай радаснай свіціцца,
Ў маршчынцы кожнай цеплыні
па жмені...
О, маці! Ты здаешся мне царыцаю,
Перад якой я стану на калені.

* * *

М. Федзюковічу.

У клубе вясковым танцы,
У клубе сягоння свята.
Танцуе на кончыках пальцаў
Дзяўчына з сябрам-салдатам.
Чаму ж засмуціліся вочы,
Чаму ж ні адной смяшынкі

На твары бялявым дзявочым,
На твары дзіўнай дзяўчынкі?
Салдат прыпыніўся ў танцы:
Ў дзявочых вачах сінеча,
Жадае да кончыкаў пальцаў
З салдатам застацца навечна.

Поры года

Ф.Ф.Цудзілу

Калі да Вас прыходзіць снежань
гномам
І за каўнер не сыпле снег, а вату,
Калі Вам да сняжыначкі знаёмы
У белых хустках ліпы па-над хатай,
Калі да Вас вясна прыходзіць феяй
І пад акном нагадвае музыку,
Што ўзяўшы ў рукі ліпавую флейту,
Іграе нешта светлае, вялікае,
І калі клён нагадвае Вам сонца,
А верас — песню, промнямі сагрэтую.
То ведайце, што ў гэты міг вось сёння
Вы можаце лічыць сябе паэтам.

Раніца

Ах, сёння вёска туманіцца —
Расчасалі дзядулі бароды.
Ты, матуля, мне будзіш раніцу
Дзіўнай песняй да болю роднай.
А яна, неспакойная, лёгкая,
Б'ецца птушкай аб нашы вокны.
Мама, бачу дзяцінства далёкае,
Што баіцца шэрага воўка.
Ну, а ты, каб мяне супакоіць,
Пачынаеш пры снежнай замяці
Тую песню, якую ніколі
Не забыць і не сцерці з памяці.
Вось і сёння вёска туманіцца —
Расчасалі дзядулі бароды.
І здаецца мне сёння раніца
Тваёй песняй, матуля, роднай.

У Купалаўскую ноч

На Беларусі ёсць месяц ліпень,
Час, калі зацвітаюць ліпы,
Час, калі залацістую квецень
Па-над хатамі носіць вецер.
Час, калі да зялёных вязаў
У Купалле прыходзяць казкі
Ў зрэбнай торбе, крыху палінялай
Іх прыносіць Янка Купала.
І гараць на кастрах няўдачы.
Ў карагодах дзяўчаты скачуць.
Над ракою і смех, і гоман,
Юнакі ў шаснаццаць, як гномы
Разбягуцца туды, дзе змалку
Кожны марыў сустрэць русалку.

* * *

Я да кончыкаў пальцаў узрушана
І бягу між крыніц і ніў.
Я ў дарогу за шчасцем рушыла,
Родны край, ты мяне паланіў.
Родны край! Невыказнай радасцю
Для мяне ты навекі стаў.
Ручнікамі здаюцца радугі
Між азёраў, палёў і траў.
Чую: песня такая блізкая
Паімкнулася птушкаю ўслед.
Навальніцы ўзбуджана бліскаюць:
Я ж люблю хадзіць па расе,
Каб ад той, непаўторнай
сцюдзёнасці
Аж займала гарачы дух.
Старана ты мая зялёная,
Я ў блакіт твой бясконцы йду!
Ну, а сонца такое вялікае,
І грыміць, і пяе небакрай.
Журавы нада мною курлыкаюць,
Пакідаючы родны край.
Толькі я не ў птушыным выраі
Па дарогах тваіх лячу.
Маё сэрца,
поўнае лірыкі,
Хоча новую песню ўчуць.

кастрычнік, 8. X. 65.

ЁН — У СВАЁЙ ДЫВІЗІІ



"...ведайце: калі мяне не стане — я ў сваю дывізію пайшоў".
Аляксей Пысін

На досвітку дзевятага лістападаўскага дня ў сваю дывізію пайшоў яшчэ адзін салдат таго крывавага і віхурнага часу, які ў свядомасці людской сплаўлены ў трох грымлівых словах — Вялікая Айчынная вайна — спынілася сэрца Аляксея Аляксеевіча Слесарэнкі, франтавіка, удзельніка штурму Берліна.

Мне цяжка пісаць гэтыя радкі, бо страціў не проста даўняга і добрага сябра, а чалавека, з якім папрацаваў амаль дзесятак гадоў у Коласавым доме, чалавека, якому можна было адкрываць сваю душу наросхрыст, нікога не баючыся, ані не задумваючыся над тым, як адгукнецца твая споведзь у заўтрашнім дні. З ім можна было спрачацца, спрачацца нават на нотах самых высокіх, і аніколі спрэчка не пакідала ў сэрцы горычы, больш за тое, спрэчка тая — а яны, гаворкі шчырыя, на поўны давер, без аглядкі, як гаворыцца, часцяком у нас з ім здараліся, — высвечвала ў тваім уласным сэрцы патаемныя закуточкі, куды чужому воку зазірнуць было немагчыма, і ты рабіў дзівосныя і нечаканыя адкрыцці, што здзіўлялі цябе самога, спараджаючы шчырую падзяку сябру, які спрычыніўся да гэтых адкрыццяў. Нешта іначылася ў тваёй душы пасля гэткіх гаворак, як бы абнаўлялася, прасвятлялася, надаючы ўпэўненасці і гарту.

Аляксей аніколі не быў абцяжараны клопатам пра тое, як паставіцца суразмоўца да ягоных слоў, бо яны, тыя словы, заўжды адлюстроўвалі яго ўласную веру, яго існасць, існасць чалавека праўдзівага і шчырага.

Мне думаецца, дакладней, я перакананы, што менавіта гэтая адметнасць асобы моцна ўразіла — а потым на доўгі час прывабіла — народнага песняра беларускай зямлі Якуба Коласа, калі ён упершыню ўбачыў Аляксея Слесарэнку. Той з'явіўся ў Коласавым доме ў той час, калі толькі-толькі адгрымелі салюты ў гонар Вялікай Перамогі савецкіх людзей над фашысцкай навалай. У франтавым шынялі. Малады. Упэўнены. Смелы.

У гады вайны ён, камандзір узвода стралковага палка, чытаў вершы Якуба Коласа сваім салдатам у акопах, потым узімку сорак першага чытаў у шпіталі, дзе ляжаў пасля цяжкога ранення, чытаў пераможцам на вуліцах Берліна, дзе чадна дагаралі старонкі вар'яцкіх планаў пра сусветнае панаванне. Цяпер ён чытаў не асобныя творы, не проста слухачам, а славутаму народнаму песняру, чалавеку, які гэтыя творы ствараў. І гэта былі не проста вершы, а вялікая — болей гадзіны сцэнічнага часу! — літаратурная кампазіцыя па творах народнага паэта, слыннага майстра мастацкага слова.

Якуб Колас слухаў маладога чытальніка ўважліва. Аніводнага разу не перапыніў, толькі калі-нікалі кідаў задумлівы позірк на сосны за акном, пад якімі яго ўласнымі рукамі былі пасаджаны тры маладыя дубочкі — дуб Якуб, дуб Даніла, дуб Міхась, і маладая бярозка ў памяць памерлай жонкі. У гэтым паркавым ансамблі, падобным на вялікую падкову, было пакінута месца і для чацвёртага дубка, сына Юрася, якога зжэр агонь ваеннай бяды, і якога бацькава сэрца ўсё яшчэ марыла ўбачыць жывым.

Скончыўшы чытанне, Аляксей стаяў нерухома, як скамянелы, з хваляваннем чакаючы, што скажа народны пясняр. Той доўга маўчаў, потым лагодная ўсмешка разгладзіла суровыя рысы твару, Якуб Колас узняўся, моцна паціснуў руку маладога чытальніка, ухваліў і кампазіцыю, і манеру чытання, і дзівосную памяць, і здольнасць трымацца прыгожа і годна. Гэта, маўляў, твая дарога, дарагі салдат!

Ухвала народнага песняра акрыліла Аляксея, ён зразумеў, што знайшоў свой шлях у мірным пасляваенным жыцці. Маскоўская студыя кінаакцёра, якую ён скончыў у 1938 годзе, і роля Мірона ў фільме "Палескія рабінзоны", пастаўленым кінафабрыкай Белдзяржкіно, і праца на студыі "Масфільм", дзе ён здымаўся ў фільмах "Бежын Луг", "Вясёлыя хлопцы", "Аэраград", і акцёрская праца ў Чарнігаўскім рускім тэатры былі толькі подступамі да творчай дарогі, што толькі цяпер адкрыла перад ім сваю шырокую і зманлівую далеч.

Аляксей пакрочыў па гэтай дарозе ўпэўнена і смела. Франтавы вопыт, веды, набытыя ў часе працы на кінастудыях, блізкае знаёмства з выдатнымі дзеячамі кінамастацтва і літаратуры прыдаліся яму ва ўсім. Ён стварыў шырока папулярныя нарысы-партрэты пра Якуба Коласа, А. Даўжэнку, С. Эйзенштэйна, бліскучага акцёра Пятра Алейнікава. Цікавыя і змястоўныя мемуарна-дакументальныя творы пра сусветна вядомых дзеячаў літаратуры і мастацтва — кнігі "Дарагія аблічча", "Жыццё ў мастацтве", "Дарогі і песні", "Працяг радасці" — адразу палюбіў чытач, неўзабаве яны былі перакладзены з беларускай на рускую, украінскую мовы. Гэтыя творы пакінуць новым пакаленням праўдзівы і яркі, непаўторны адбітак цікавага часу, якім жыла вялікая дзяржава з назвай, што застаецца ў гісторыі планеты Зямля на вякі — Савецкі Саюз.

Але асноўным у доўгім і шматгранным жыцці гэтай адметнай асобы, пісьменніка, нарысіста, акцёра, заслужанага дзеяча культуры Беларусі засталося тое, на што звярнуў увагу слынны сын зямлі беларускай Якуб Колас у дзень іх першай сустрэчы — папулярызацыя і распаўсюджванне ў масах лепшых здабыткаў беларускага мастацкага слова. Пасля першай, ухваленай народным песняром літаратурнай кампазіцыі, ён стварыў арыгінальныя і бліскучыя кампазіцыі па класічных творах Якуба Коласа "Новая зямля", "Рыбакова хата", "Сымон музыка", па выдатнай кнізе М. Лужаніна "Колас расказвае пра сябе" і шэрагу іншых твораў таленавітых беларускіх пісьменнікаў. Ён падыходзіў да стварэння гэтых кампазіцый з вялікай адказнасцю, як прафесійны майстар — у свой час Аляксей скончыў курсы мастацкага чытання, — які добра разумее, што мастацкае слова павінна не проста прагучаць з эстрады, не проста ўсхваляваць сэрца слухача, а застацца ў тым сэрцы назаўсёды.

Дзеля таго, каб дасягнуць менавіта гэтага выніку Аляксей рупіцца штодня, упарта і паслядоўна. Болей дзесяці гадоў ён працуе навуковым супрацоўнікам Літаратурнага музея Якуба Коласа, дзе дырэктарам быў доўгі час — ад першага дня заснавання Коласавага дома як навукова-даследнай установы — старэйшы сын народнага песняра Даніла Канстанцінавіч Міцкевіч. Ад гэтага мудрага, высокаадукаванага і абаяльнага чалавека шмат добрага, чыстага святла пералілося ў літаратурныя кампазіцыі, што ствараў Аляксей Слесарэнка. Адна з гэтых кампазіцый прагучала ў 1955 годзе ў Маскве на дэкадзе беларускага мастацтва.

А ў Беларусі яны гучалі год за годам. Гучалі ў вялікіх палацах культуры і маленькіх вясковых клубах, у школьных аўдыторыях і студэнцкіх інтэрнатах, у заводскіх цэхах і раённых бібліятэках. Не сотні, а многія тысячы літаратурных вечароў правёў ён у самых аддаленых куточках рэспублікі, скалясіўшы яе, як кажуць, удоўж і ўпоперак, у час летні і зімовы. Са сваімі літаратурнымі кампазіцыямі ён, у пераважнай большасці, выступаў адзін, без суправаджэння, без памагатых, і магічная сіла мастацкага слова, выключнае майстэрства чытальніка стварала дзівосную ауру, у якой слухач не проста слухаў, а жыў у новым для яго свеце, поўным гаючага хараства і ачышчальнай прыгажосці. Не воплескі ўдзячных слухачоў — яны звычайна гучалі доўгадоўга, — а прасветленыя людскія твары былі заўсёды найвышэйшай узнагародай чытальніку.

Не чатыры маладыя дубкі і белабелая бяроза, пасаджаныя рукамі народнага песняра Якуба Коласа і да якіх шмат разоў дакраналіся рукі Аляксея Слесарэнкі, а магутныя волаты стаяць зараз каля Коласавага дома. Дубовыя шаты ўзняліся вышэй даху, завіслі над чубком сасняку, і адтуль, з высі, нават у ціхае надвор'е ліецца на зямлю таемны пошум галля, як вечны запавет шанаваць і берагчы роднае слова, без якога не можа жыць вольны чалавек.

Мой сябар Аляксей чуе — перакананы! — гэты пошум, і зямля, якой ён верна служыў усё сваё жыццё, не цісне на дамавіну невыносным цяжарам, яна лёгкая быццам таполевы пух, што кружляе ў паветры ўлетку.

Алесь САВІЦКІ

Метэарытнае жалеза

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 9)

перац — гарошак чорны, як прасілі, прывезла...

Суседка затрымалася ў яе нядоўга. І, як толькі яна пайшла, Вольга Пятроўна пачала рабіць, як гэта яна называла, абход сядзібы. І па ходу нешта парадкавала. Перасохлыя корчыкі, даўно саспелай фасолі, звязала ў пукі, падвесіла на сонечным баку хаты. Выбраную цыбулю занесла на гарышча, хай падсыхае... І паміж гэтым, такім ужо звыклым клопатам, раз-пораз заходзіла ў хату, пазірала на гадзіннік: «Хоць бы не спазніцца?!» А час, бы стаяў на месцы. Але вось, нарэшце, можна ўсё адкласці на невядомае потым: да прыезду Паўла Мікалаевіча засталася гадзіна. Яна хвілін пятнаццаць аддала люстэрку. І ўжо такая, якою ён прывык яе бачыць, выйшла за веснічкі. Вырашыла ісці напрасткі, праз бульбяны палетак, праз нізінку, зарослую густым алешнікам, за якою ўжо недалёка і жаданая паваротка.

Яна прыйшла на прызначанае месца рыхтык а дзевятай гадзіне. Машыны праляталі міма яе адна за адной... Узіраючыся, яна выходзіла насустрач ім амаль на шашу і толькі тады, калі побач спынілася цёмна-шэрая «Мазда», і з прычыненага акна пачулася; «Вам куды? А то яшчэ заначуеце тут!», яна зразумела, што Павел Мікалаевіч не прыедзе. Наваколле ўжо ахутаў густы змрок і блізкая нізінка заплыла туманам, але Вольга Пятроўна пайшла паўз яе ранейшым шляхам. «Пракляты бак! Відаць, давялося ўсё-ткі яго заварваць, — думала яна. — Колькі разоў казала Пашу, каб не звязваўся з абы-кім, звяртаўся толькі да прафесіяналаў! А ён усё, каб танней! Да няўмекі нейкага паехаў. Колькі там трэба таго часу, бак заварыць! Лепш з умелым згубіць, чым з лайдаком зэканоміць!» — спаганяла яна ўсю сваю горыч на невядомым ёй аўта-слесары. У цемры ішла наўздагад і выйшла не да сваіх веснічак, а да крайняй хаты. Абышла яе і апынулася на вузкай гравейцы... І ў тое ж імгненне сэрца яе ўзляцела кудысьці высока-высока: ля іхняй сядзібы стаяла машына. Але сэрца, як узляцела, так і апусцілася. Вольга Пятроўна пазнала сваю машыну. У вокнах хаты гарэла святло. І, калі яна ўвайшла, пабачыла за сталом дачку. Каця намазвала на булку паштэт... Муж стаяў ля раскрытага халадзільніка, быццам прыкідваў, што б яму такое выняць адтуль!

— Ты ў суседзяў была? — Запыталася дачка. — А мы тут ужо хвілін пятнаццаць. Паштэт смачны атрымаўся. Што на цябе найшло, ма-а? Такога смакоцця нагатавала!

— Гэта, Кацярына, інтуіцыя маму вяла, — адазваўся муж, захлопваючы халадзільнік. — Яна думала, што едзе на сядзібу адна, а падсвядома адчувала, што мы рушым следам... Вось і нагатавала ўсяго. Інтуітыўна! Нават на грыжу сваю махнула рукой, такую сумку цягнула.

Вольга Пятроўна суха пасміхнулася.

— І, чаго ж гэта вы рушылі следам? Што здарылася?

Муж сеў за стол побач з дачкою, адламаў кавалачак булкі, намазаў паштэтам...

— Разумееш, страшная штука пахаванне. У галаву ўсялякія думкі палезлі пра тленнасць быцця і ўсё такое... Я нават на жалобны стол не застаўся, — укінуў булку ў рот, пажаваў. — Жонка Куляша, дакладней, ужо ўдава прытомнасць страчвала. Хаця, у прынцыпе, і не жонка, і не ўдава. Казалі, яны даўно развяліся. Можа, кватэру хацелі яшчэ адну купіць, а, можа... — і ён запнуўся.

Вольга Пятроўна зноў суха пасміхнулася, падышла да акна, зашморгнула гардзіну.

— Было вельмі смачна, — дачка паднялася з-за стала. — Мне трэба ехаць. Цалую ўсіх! Праводзіць будзеце?

І, калі правёўшы дачку, яны зноў вярнуліся ў хату, Вольга Пятроўна адразу ж сказала:

— Я пайду ўкладацца. За дзень натамілася. А ты павячэрай, калі хочаш. Я не буду.

І, зайшоўшы за перагародку ў невялікі пакойчык, дзе яна звычайна спала, пачала рассцілаць ложак. Падняла падушку і міжволі схамянулася: на прасціне ляжалі тры чорныя каменьчыкі, даволі-такі вялікія. Круглыя і пляскатыя, бы расціснутыя шарыкі з пластыліну. «А гэта яшчэ, што такое?» — падумала яна.

— Вольга, чуеш? — Адгукнуўся з-за перагародкі муж. — Мяса на костачцы? Гэта ж не свініна!

— Бараніна! — Гучна адазвалася яна. — На Камароўцы купіла.

З гэтымі словамі Вольга Пятроўна і выйшла да мужа, трымаючы падушку ў руках. Ён еў. Яна памаўчала і сказала сцішана:

— У мяне там каменне нейкае пад падушкай. Адкуль яно магло ўзяцца?

— Э-э, гэта не каменне, Волечка. Гэта — метэарытнае жалеза. Кажуць, некалі тут метэарыт упаў. На сядзібе круглячкі гэтыя знайшоў... Ну і паклаў пад падушкі. Тры табе, тры мне... Як кажуць, на шчасце. Усё ж, з неба. Адтуль, — паказаў рукою ўверх. — Падарунак нябёсаў...

Яна затрымала на ім доўгі позірк і, нічога не сказаўшы, пайшла за перагародку. Кінула падушку на ложак і легла... За перагародкаю хлопалі дзверцы халадзільніка, бразгацеў посуд, з крана лілася вада... Вольга Пятроўна правалвалася ў сон, гэткі ж неспакойны, як гарачая, поўная таемных гукаў і шолахаў, жнівеньская ноч. Праўда, яшчэ паспела падумаць: «Трэба будзе заўтра ж выкінуць з-пад падушкі гэтае смецце!»

Так, смецце...

ЗАХАРАВА, 19

Пішыце на адрас: 220005, Мінск, вул. Захарава, 19, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва";
e-mail: minsk@lim.by
Адрас у Інтэрнеце — www.lim.by

Кнігі можна набыць у Рэдакцыйна-выдавецкай установе "Літаратура і Мастацтва". Тэлефоны аддзела маркетынгу і рэкламнай дзейнасці: 284-79-65; (факс) 284-82-04.

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва", рэдакцыя газеты "ЛіМ" смуткуюць з прычыны смерці пісьменніка, заслужанага дзеяча культуры Беларусі Аляксея Аляксеевіча Слесарэнкі і выказваюць шчырае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Калектыў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа глыбока смуткуе з прычыны смерці былога супрацоўніка, пісьменніка, заслужанага дзеяча культуры Беларусі Аляксея Аляксеевіча Слесарэнкі і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Рэдакцыя часопіса "Вожык" смуткуе ў сувязі са смерцю заслужанага дзеяча культуры Беларусі, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, пісьменніка, майстра мастацкага чытання А. А. Слесарэнкі і выказваюць спачуванне сям'і нябожчыка.

Скажу адразу: перш чым я ўбачыў узорны ансамбль танца "Чабарок" на сцэне, ужо шмат чаго пра яго пачуў і ведаў. Было і інтэрвью з мастацкім кіраўніком (якое яшчэ прыгадаю), і знаёмства з узнагародамі, прагляд дыпломаў, і прысутнасць на рэпетыцыях старэйшай і малодшай груп. А потым патрапіў і на выступленне, якім гэты калектыў адкрываў турнір па інтэлектуальных гульнях "Несцерка-2005".

ЧАБАРОВЫ ФЕЕРВЕРК

Ля ўваходу ў паўнюткую залу Палаца дзяцей і моладзі мне загадалі зняць верхняе адзенне. Я адказаў, што толькі зраблю некалькі кадраў і адразу пакіну залу. Схлусіў. Бо выступленне "Чабарка" мне спадабалася і я паглядзеў яго цалкам. Што магу сказаць? Прафесійна, відовішчна і ў нацыянальных касцюмах. Дзе-нідзе выкарыстоўваюцца нават акрабатычныя элементы. Было прыемна бачыць, што падлеткі ў нашай краіне шануюць народную культуру.

І не толькі падлеткі. Перад выступленнем "Чабарка" мне давялося папрысутнічаць на рэпетыцыі малодшай групы. Шасцігадовыя, калі не менш, яны старанна вывучалі танец, сочачы за выкладчыкам. Прычым, я не ўбачыў, каб іх хто-небудзь прымушаў. Няўжо танцамі займаюцца па сваёй волі? (Раскажу яшчэ і пра гэта). Як бы там ні было, паралаваўся за тое, што ёсць такія маленькія беларусы, якіх цікавяць не толькі камп'ютэрныя гульні.

Бачыў і размінку старэйшай групы, якую праводзілі студэнты-практыканты з Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і БДУ культуры. А мастацкі кіраўнік "Чабарка", балетмайстар Наталля Дзягель пільна сачыла за гэтым працэсам. Танцоры са старэйшай групы ішлі па крузе і выконвалі практыкаванні для распрацоўкі ног і рук. Падумалася, а ці змог бы сам?

Урэшце, давялося пагутарыць з Наталляй Леанідаўнай і праз яе расповед пазнаёміцца з ансамблем.

— "Чабарок" з'явіўся на свет у 1986 годзе пры Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі. Спачатку ў калектыве было чалавек шэсцьдзесят, паступова колькасць павялічвалася. На сёння ў "Чабарку" займаецца 200 дзяцей і падлеткаў ва ўзросце ад 5 да 20 гадоў. Дарэчы, назва ансамбля была прыдумана менавіта дзецьмі на конкурснай аснове. Мы займаемся пераважна народным танцам, арыентуемся на дзіцячы гульнявы фальклор.

— Раскажыце пра творчы працэс, пра стварэнне танцаў.

— Зразумела, спачатку прыдумваем сам нумар, нейкі вобраз, потым падбіраем музыку (для гэтага ў нас ёсць акампануючая група з пяці чалавек) — і так атрымліваюцца новыя пастаноўкі.

— Музыка народная?

— Раней была толькі народная. Але час рухаецца наперад, моладзь хоча рабіць і нешта сучаснае. Таму мы на аснове "народных" рухаў робім пастаноўкі ў стылі фольк-мадэрн. Ёсць нумары эстраднага кшталту, рок-н-рол, ёсць і класічныя пастаноўкі. Карацей — розныя напрамкі ў харэаграфіі.

— Дзеці добраахвотна ідуць у "Чабарок"?

— Зусім малых прыводзяць бацькі. Зразумела, некаторых пад прымусам. Многія на занятках нават плачуць. І вельмі важна ў гэтым узросце зацікавіць дзіця, дапамагчы яму палюбіць народны танец, нашы традыцыі... А потым ужо самі бягуць да нас, нават студэнты.

— З якога ўзросту звычайна дзеці пачынаюць добраахвотна займацца?

— Мне здаецца, гадоў з 12-ці. Тады яны ўжо самі хочуць танцаваць. Зразумела, падабаюцца ім і гастролі, выступленні.

— Куды паспелі з'ездзіць?

— Шмат куды. У Германію, Польшчу, Чэхію, Італію, Турцыю, Македонію... Напрыклад, апошняя паездка была ў Іспанію і Францыю. Мне вельмі падабаецца тое, што ў Францыі праводзяцца тэматычныя фэсты. Калі мы былі першы раз, там праводзілася імпрэза пад назвай "Вяселлі дзяцей свету". І кожная краіна паказвала свой абрад вяселля, зразумела, у харэаграфічным адлюстраванні. Усё гэта робіцца гэткім цікавым мюзіклам, з высакаякасным святлом і апаратурай. І шмат людзей наведвае такія фэсты... Дарэчы, іншаземная публіка так любіць народныя танцы! Гэткага стаўлення не хапае нашым людзям — можа, з-за таго, што ў нас фальклор — даволі звыклая з'ява. А за мяжой на афішах пішуць: "Феерверк беларускага фальклору".

— Памятаеце вашы першыя гастролі?

— Мы тады ездзілі ў Германію. Давалі канцэрты, і немцы пералічвалі грошы ці пастаўлялі апаратуру для дзяцей, якія пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС. Дарэчы, у межах гэтай праграмы, "Дзеці — дзецям", мы выступалі у дамах састарэлых, у цэрквах. Пабачыўшы такіх здольных дзяцей, немцы вельмі здзіўляліся... У пазамінулым годзе мы былі ў Італіі. Там — тое ж самае: "Мы ўбачылі другі твар Беларусі", — гаварылі італьянцы. Бо яны ў асноўным прымаюць на аздараўленне дзяцей з найбольш пацярпелай глыбінкі, а тут — дзеці, якія насамрэч прыехалі паказаць сваё мастацтва і нічога не патрабуюць узамен, выдатна танцуюць, валодаюць англійскай мовай.

— Куды ў бліжэйшы час плануеце ехаць?

— Са старэйшай групай — у Фінляндыю, на маладзёжны фестываль, у якім бяруць удзел таксама прадстаўнікі Венгрыі, ЗША, Харватыі, Турцыі. Потым збіраемся зноў у Італію, дзе плануюцца выступленні ў Рыме, Мілане.

— А як наконт конкурсаў?

— У асноўным, дзе б мы ні былі, заўсёды вылучаліся калі не як самыя лепшыя, то як адны з такіх. Напрыклад, я ў мінулым годзе вазіла ў Чэхію адну пару дзяцей, і яны сталі першымі на міжнародным фестывалі народнага танца. Там былі пары з 15-ці краін — з Калумбіі, з Коста-Рыкі, напрыклад. У нашай краіне сёлета "Чабарок" стаў лаўрэатам фестываляў "Беларусь — мая песня", "Сузор'е". І цяпер у нас ёсць магчымасць атрымаць званне заслужанага ансамбля.

— І што яшчэ ў перспектыве?

— У наступным годзе "Чабарку" будзе 20 гадоў. Таму ў канцы красавіка — пачатку траўня мы плануем зрабіць фальклорны фестываль і запрасіць у госці замежных сяброў, якіх у нас вельмі шмат.

Алесь КІРЫКОВІЧ

Фота забяспечана аўтарам

ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА І ПАЎГОДДЗЕ 2006 ГОДА!

«Літаратура і мастацтва»
Індывідуальная (індэкс — 63856)
на 1 месяц —4000 руб.
на 3 месяцы — 12000 руб.
Ведамасная (індэкс — 638562)
на 1 месяц — 5200 руб.
на 3 месяцы — 15600 руб.
Льготная (індэкс — 63880)
на 1 месяц — 4200 руб.
на 6 месяцаў — 25200 руб.

"Маладосць"
Індывідуальная (індэкс — 74957)
на 1 месяц — 4200 руб.
на 3 месяцы — 12600 руб.
Ведамасная (індэкс — 749572)
на 1 месяц — 5200 руб.
на 3 месяцы — 15600 руб.
Льготная (індэкс — 00731)
на 1 месяц — 4200 руб.
на 6 месяцаў — 25200 руб.

"Полымя"
Індывідуальная (індэкс — 74985)
на 1 месяц — 4000 руб.
на 3 месяцы — 12000 руб.
Ведамасная (індэкс — 749852)
на 1 месяц — 5000 руб.
на 3 месяцы — 15000 руб.
Льготная (індэкс — 00727)
на 1 месяц — 4100 руб.
на 6 месяцаў — 24600 руб.

"Всемирная литература"
Індывідуальная (індэкс — 74863)
на 2 месяцы — 4500 руб.
на 4 месяцы — 9000 руб.
Ведамасная (індэкс — 748632)
на 2 месяцы — 5200 руб.
на 4 месяцы — 10400 руб.
Льготная (індэкс — 00729)
на 2 месяцы — 5000 руб.
на 6 месяцаў — 15000 руб.

"Нёман"
Індывідуальная (індэкс — 74968)
на 1 месяц — 4000 руб.
на 3 месяцы — 12000 руб.
Ведамасная (індэкс —749682)
на 1 месяц — 5000 руб.
на 3 месяцы — 15000 руб.
Льготная (індэкс — 00728)
на 1 месяц — 4100 руб.
на 6 месяцаў — 24600 руб.

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР

Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:

Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Уладзімір ДАВЫДОЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара)
Віктар КАВАЛЁЎ
Янка ЛАЙКОЎ
Інеса ПЕТРУСЕВІЧ
Ірына ШАЎЛЯКОВА
Наталля ЯКАВЕНКА

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-81-53
паэзіі, літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы — 284-66-73
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-81-53
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ". Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79

Індэкс 63856 Наклад 2895
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 16.11.2005 у 11.00

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 1352

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12